

«Звязда», якая працуе на зямлі

СТАР. 3



Чырвоны генерал з-пад Лоева

СТАР. 5



Дыябет — працэй засцерагчыся, чым лячыць

СТАР. 6

Выдаецца з 9 чэрвеня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

16 ЛІСТАПАДА 2016 г. СЕРАДА № 221 (28331)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

# КАПІТАЛЬНАЕ ПЫТАННЕ

## Прэзідэнт патрабуе павысіць эфектыўнасць выкарыстання дзяржмаёмасці

**Адно з праблемных пытанняў у гэтай сферы — нерацыянальнае выкарыстанне вызваленых у Мінску капітальных будынкаў прамысловых прадпрыемстваў — стала ўчора тэмай для абмеркавання на ўзроўні кіраўніка дзяржавы.**

«Справа ў тым, што ў апошні час шырокі грамадскі рэзананс атрымала сітуацыя з нерацыянальным выкарыстаннем у нашай сталіцы вызваляемых капітальных пабудоў прамысловых прадпрыемстваў. Размешчаны яны ў цэнтры горада і могуць быць выгадна рэалізаваны інвестарам. Пакуль так не атрымліваецца па асобных прадпрыемствах», — адзначыў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што пытанні па адчужэнні дзяржуласнасці, якая знаходзіцца ў бязвыплатным карыстанні арганізацый, не вырашаюцца гадамі.

Гаворка, у прыватнасці, ішла аб выкарыстанні дзяржаўнай маёмасці, размешчанай у межах сталічных вуліц Кульман, Веры Харужай і Якуба Коласа. Яшчэ ў студзені 2014 года Прэзідэнт даў распараджэнне аб адчужэнні 18 дзяржаўных будынкаў Мінскага вытворчага аб'яднання вылічальнай тэхнікі, якія не выкарыстоўваюцца. Згодна з гэтым распараджэннем, на працягу года маёмасць павінна была быць рэалізавана на аўкцыёне. «Рабочая група, у склад якой увайшлі прадстаўнікі зацікаўленых органаў, у тым ліку Камітэта дзяржаўнага кантролю, у 2014—2015 гадах правяла чатыры адкрытыя аўкцыёны, а воз, як кажуць, і сёння там. Ні адзін з іх не быў прызнаны спраўджаным з-за адсутнасці ўдзельнікаў», — канстатаваў кіраўнік дзяржавы.

Ён адзначыў, што цяпер з'явіліся новыя магчымасці для адчужэння гэтых аб'ектаў, а ўрад падрыхтаваў і ўнёс адпаведны новы праект распараджэння.

Перад удзельнікамі нарады быў пастаўлены шэраг канкрэтных пытанняў. Яны тычыліся таго, якія прапановы ўнесены патэнцыйным пакупнікам, наколькі яны адпавядаюць патрабаванням горадабудаўнічых нормаў і выгадныя дзяржаве, ці ўлічаныя інтарэсы радавых грамадзян у праекце распараджэння, і на якіх умовах будзе здзейснены продаж, наколькі рацыянальныя прапанаваныя падыходы ў цэлым. «Але самае галоўнае пытанне: чаму ў такім месцы дзяржава ў асобе райвыканкама, гарвыканкама і ўрада адмаўляецца ад выкарыстання ў інтарэсах той жа дзяржавы гэтых плошчаў? Гэта што — нежаданне, няздольнасць, ці ёсць аб'ектыўныя прычыны?» — заўважыў Прэзідэнт.

Вынікам абмеркавання стала рашэнне аб тым, што асноўным суб'ектам, які будзе развіваць гэтую тэрыторыю, стане Парк высокіх тэхналогій. Ён будзе ствараць прастору для працы праграмістаў і кампаній, якія плануюць развіваць новыя бізнес-ідэі. У планах таксама прыцягненне прыватных інвестараў для развіцця спадарожных напрамкаў у сферы абслугоўвання, гандлю, грамадскага харчавання, стварэння спартыўных пляцовак.

Кіраўнік дзяржавы даў даручэнні па выкананні дадзенай канцэпцыі ў самыя жорсткія тэрміны, паведамляе прэс-служба Прэзідэнта. На працягу двух гадоў гэтая пляцоўка ў цэнтры Мінска павінна выглядаць зусім па-новаму і адпавядаць самым сучасным патрабаванням. Таксама неабходна ўжо ў бліжэйшы час распрацаваць і зацвердзіць адзінае рашэнне для знешняга аблічча адпаведных будынкаў, каб навесці ў гэтым пытанні належны парадак.

Аляксандр Лукашэнка даручыў на працягу тыдня дапрацаваць праект распараджэння ў дачыненні да дадзенай тэрыторыі і ўнесці яму для канчатковага разгляду.

# СУСЕДЗІ З ЗАВУЦЦЯ



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Гэты кадр фотакарэспандэнт «злавіў» у аб'ектыў у вёсцы Завуцце Мёрскага раёна, калі суседзі Зінаіда ЛАПІЦКАЯ і Мікалай і Наталля ГАНЕБНЫЯ, што ў згодзе і міры жывуць побач не першы год, ішлі па ваду да студні, якую яны дзеляць на два двары.

### ЦЫТАТА ДНЯ



**Галіна ПАРХІМОВІЧ, кансультант упраўлення друкаваных сродкаў масавай інфармацыі і знешніх сувязяў Міністэрства інфармацыі:**

*«Для каардынацыі дзейнасці па абароне дзяцей ад інфармацыі, якая наносіць шкоду іх развіццю і здароўю, пры ўрадзе краіны будзе створаны грамадска-кансультатыўны савет, які будзе разглядаць пытанні, звязаныя з прымяненнем заканадаўства ў сферы абароны дзяцей ад шкоднай інфармацыі. У прыватнасці, гэта могуць быць пытанні аб неабходнасці прысваення той ці іншай інфармацыйнай прадукцыі знака ўзроставай катэгорыі і іншыя. Пры гэтым рашэнні савета будуць насіць рэкамендацыйны характар для дзяржаўных органаў, якія ажыццяўляюць рэгуляванне пытанняў у гэтай сферы».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 16.11.2016 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9581 | ▼ |
| Еўра | 2,1109 | ▼ |
| Рас. руб. | 0,0298 | ▲ |
| Укр. грыўня | 0,0751 | ▼ |

■ Урад

## Макраэканамічная стабільнасць дасягнута

### Пра гэта ўчора заявіў прэм'ер-міністр

**У Савеце міністраў падчас чарговага пасяджэння падвялі вынікі сацыяльна-эканамічнага развіцця за дзевяць месяцаў бягучага года. Па словах Андрэя КАБЯКОВА, прэм'ер-міністра Беларусі, ураду ўдалося дасягнуць макраэканамічнай стабілізацыі. Акрамя таго, на мерапрыемстве былі разгледжаны крокі і ход рэалізацыі Указа Прэзідэнта № 78 «Аб мерах па павышэнні эфектыўнасці сацыяльна-эканамічнага комплексу» краіны.**

СТАР. 2

■ Грамадства

## ГЭТА НЕ ІХ ВАЙНА, АБО ПРА ДЗЯЦЕЙ — НІ СЛОВА

### Як праходзіць рэйд па рабоце з неплацельшчыкамі аліментаў

**У сферы абавязкаў супрацоўнікаў Аддзела прымусовага выканання — спагнанне даўгоў. Але не варта блытаць іх з калектарамі: тут усё на законнай аснове. Пасля афіцыйных паведамленняў, званкоў па тэлефоне, наступны этап — візіт да неплацельшчыка. Здавалася б, каму, як не групе суровых мужчын, займацца такімі справамі, аднак на сустрэчу з карэспандэнтамі «Звязды» прыходзяць дзве мініяцюрныя дзяўчыны — у такія рэйды яны адпраўляюцца кожны тыдзень.**

Работніцы Ленінскага АПВ **загадчыца сектара Марына ЯКІМОВІЧ** і **судовы выканаўца Ірына БЕКІШ** да сваіх абавязкаў ставяцца спакойна: работа ёсць работа.

— Я абапіраюся на закон, дакладна ведаю, што магу рабіць і гаварыць, а што не. Таму ўсе абразы, якія нярэдка чую ў свой адрас, прапускаю міма вушэй. Людзі ж не асабіста на мяне злуюць, а на саму сітуацыю, — разважае Марына.

— Усялякае бывае... На мяне адзін раз і з кулакамі кідаліся. Калі плануецца маштабны рэйд, то мы бяром з сабой супрацоўнікаў міліцыі або можам звярнуцца да іх у крытычнай сітуацыі, — дадае Ірына.

СТАР. 3

■ Аты-баты

## БЫЦЬ КАРЫСНЫМ СВАЁЙ КРАІНЕ

### Гэтай восенню звыш 10 тысяч прызыўнікоў папоўняць армейскія шэрагі. Для праходжання службы ў рэзерве накіравана каля 2 тысяч чалавек

**На тэрыторыі ваенных камісарыятаў краіны ўчора было надзвычай шматлюдна. Прызыўнікоў, якія сёння сталі вайскоўцамі, праводзілі ў армію цэлымі сем'ямі. Ужо праз месяц, падчас цырымоніі прыняцця ваеннай прысягі, гэтыя «зялёныя» і крыху несур'ёзныя сёння юнакі стануць смелымі і адказнымі мужчынамі — якімі павінны быць сапраўдныя абаронцы сваёй Айчыны.**

Адпраўка новага папаўнення ва Узброеныя Сілы, іншыя войскі і вайсковыя фарміраванні Беларусі працягнецца да канца месяца. Першыя — каля 1300 прызыўнікоў — папоўняць шэрагі сіл спецыяльных аперацый, сухапутных войск і Ваеннай камендатуры Узброеных Сіл. З тымі, хто крышачку раней апране ваенную форму і стане ў рады армейскай эліты, карэспандэнты «Звязды» сустрэліся ў Мінскім гарадскім ваенным камісарыяце.

СТАР. 3



Фота Надзеі БУЖАН.

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### Новы прэзідэнт Малдовы можа ініцыяваць змяненне Канстытуцыі

Новаабраны прэзідэнт Малдовы Ігар Дадон будзе дамагацца датэрміновых парламенцкіх выбараў і не выключыў правядзення рэферэндуму па ўнясенні змяненняў у Канстытуцыю. Ігар Дадон падкрэсліў, што цяперашнюю парламенцкую большасць прадстаўляюць іншыя партыі, не згодныя з праграмай Партыі сацыялістаў, якую прадстаўляе ён. «Мы зрабілі першы крок, яшчэ вельмі сур'ёзная барацьба наперадзе, але мы да яе гатовы», — заявіў прэзідэнт. Ён прызнаў, што ва ўмовах, калі практычна ўсе паўнамоцтвы сканцэнтраваныя ў руках урада і парламента, новаму прэзідэнту будзе няпроста праводзіць сваю палітыку, але адзначыў, што ў прэзідэнта, выбранага напрамую ўсім народам, ёсць маральныя правы патрабаваць рэформаў і змен. «Калі парламенцкая большасць не пагодзіцца з меркаваннем прэзідэнта, якога выбраў увесь народ, тады прэзідэнт можа выйсці на рэферэндум, памяняць Канстытуцыю, папрасіць больш паўнамоцтваў ці роспуску парламента», — канстатаваў ён.

### У Казахстане выпусцяць банкноту з выявай Назарбаева



Банкнота з выявай прэзідэнта Казахстана Нурсултана Назарбаева будзе выпушчана абмежаваным накладам да Дня Прэзідэнта — 1 снежня. Пра гэта паведаміў старшыня Нацыянальнага банка Казахстана Даніяр Акішаў. Прэзентацыя новай банкноты вартасцю 10 тыс. тэнге адбылася ў ходзе канферэнцыі «25 гадоў Незалежнасці Казахстана: Нацыянальная валюта» ў Палацы міру і згоды. «Тэма размяшчэння партрэтаў на банкнотах не новая. Больш за тое, гэта найбольш яркая, звыклая і зразумелая форма выказвання ідэй дзяржаўнасці праз размяшчэнне малюнкаў асоб, якія ўнеслі самы значны ўклад у жыццё краіны», — сказаў Даніяр Акішаў. Паводле яго слоў, банкнота з выявай Нурсултана Назарбаева па праву зойме сваё месца ў шэрагу банкнот з партрэтамі многіх выдатных дзеячаў, такіх як Чэрчыль, Атацюрк, Нэльсан Мандэла і іншых.

### Міністр эканомразвіцця Расіі затрыманы за вымаганне $2 млн

Міністр эканамічнага развіцця Аляксей Улюкаеў затрыманы па падазрэнні ў атрыманні хабару ў $2 млн за тое, што яго ведамства ўхваліла выкуп кампаніяй «Раснафта» дзяржаўнага пакета акцый «Башнафты». Сама нашумелая здзелка, як заяўляе следства, здзейсненая на законных падставах і прадметам расследавання не з'яўляецца. Дадзеных пра абставіны затрымання міністра пакуль няшмат. Следства паведамляе толькі, што Улюкаеў быў затрыманы з доказамі злачынства пры атрыманні грошай. Крымінальная справа ўзбуджана па ч. 6 арт. 290 КК РФ («Атрыманне хабару»). Максімальная санкцыя гэтага артыкула прадугледжвае штраф у памеры ад 80-кратнай да 100-кратнай сумы хабару з пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады або займацца пэўнай дзейнасцю на тэрмін да 15 гадоў альбо пазбаўленне волі на тэрмін ад 8 да 15 гадоў са штрафам у памеры да 70-кратнай сумы хабару або без такога.

## КОРАТКА

**Новым кіраўніком прадстаўніцтва Еўрапейскага банка рэканструкцыі і развіцця ў Беларусі стаў Аляксандр Піварскі. Ён замяніў на гэтай пасадзе Франсіса Дэлея, які кіраваў офісам банка ў Беларусі з 2011 года. Да назначэння на гэту пасаду Аляксандр Піварскі працаваў намеснікам дырэктара офіса прэзідэнта ЕБРР.**

Уборка цукровых буракоў завяршылася ў Беларусі. У гэтым годзе пад іх было адведзена 94,3 тыс. га. Усяго накапана 4 222,5 тыс. т цукровых буракоў. Сярэдняя ўраджайнасць склала 447,8. Самая высокая ўраджайнасць адзначана ў Гродзенскай вобласці (509,9 ц/га).

**Аляксандр Мінёнак разам з шоу-балетам «Сенсацыя» выступіць на фінальным шоу дзіцячага конкурсу песні «Еўрабачанне-2016» у горадзе Валета пад дзявятым нумарам.**

■ Я зноў выбіраю «Звязду»

## АДПАВЕДНАСЦЬ ВЫСОКІМ СТАНДАРТАМ

**Ігар МАРЗАЛЮК, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу па адукацыі, культуры, навуцы, — даўні чытач нашай газеты. Ён з задавальненнем расказаў, чаму аддае перавагу менавіта штодзённай газеце на беларускай мове.**



— У першую чаргу «Звязда» для мяне — гэта, сапраўды, родная газета на роднай мове, бо я думаю па-беларуску, — прызнаўся Ігар Аляксандравіч. — Па-другое, калі казаць пра ўзровень аналітыкі, то ён таксама адпавядае высокім стандартам. Самі па сабе рубрыкі цікавыя... Аўтары ўзнімаюць актуальныя праблемы, якія сапраўды хвалююць грамадства. Усё гэта — «Звязда»!

У газеце — высокая вартасць тэксту, у тым ліку мовы, моўных практык. Добрая якасць макетавання, выкладання, а самае галоўнае — высокі ўзровень падачы матэрыялаў.

Безумоўна, мяне радуе і тое, што «Звязда» — парламенцкая газета. Думаю, на старонках «Звязды» мы будзем і надалей абмяркоўваць балючыя актуальныя праблемы. Тым больш, што падчас маёй работы ў пятым парламенцкім скліканні «Звязда» не раз пісала пра ахову гісторыка-культурнай спадчыны, пра Кодэкс аб культуры. Думаю, наступае час дэтальнага, зацікаўленага абмеркавання новай рэдакцыі Кодэкса аб адукацыі, які са дня на дзень паступіць у Палату прадстаўнікоў. Ён датычыцца практычна кожнага беларуса, не кажучы ўжо пра тое, што ў галіне працуе больш за мільён чалавек, што Кодэкс аб адукацыі, як і сама адукацыя — гэта наш стратэгічны запас, без якога мы не зможам пабудаваць эканоміку ведаў, інавацыйную эканоміку.

«Звязда» — вельмі важны рэсурс для захавання гістарычнай, культурнай памяці. Выдавецкі дом «Звязда» робіць для гэтага вельмі шмат.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.**

ISSN 1990 - 763X

16221>

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

ПІШАМ ПРА ТОЕ, ШТО САПРАЎДЫ ВАЖНА,
5 разоў на тыдзень!
Ідзе падпіска на «Звязду» на I квартал і I паўгоддзе 2017 года!
ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

■ Ведай нашых!

# ЗОРНЫ ЧАС «ЗВЯЗДЫ»

## У 1930 годзе сяляне вёскі Залессе Чачэрскага раёна вырашылі аб'яднацца ў калгас. І назвалі яго ў гонар нашай газеты

**Сёння Адкрытае акцыянернае таварыства «Звязда» — адна з найлепшых калектыўных гаспадарак не толькі Гомельшчыны, але і краіны. Амаль дзесяць апошніх гадоў яе ўзначальвае Галіна Пятроўна ТРЫБУНАХ, якая сёлета абрана членам Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу.**



Дырэктар сельгаспрадпрыемства «Звязда» Галіна ТРЫБУНАХ.

Адметна, што ў маі 2007 года, калі гэта абаяльная жанчына ўзначаліла гаспадарку, вопыту практычнай работы ў аграрнай галіне ў яе зусім не было, бо раней ні ў адной з калектыўных гаспадарак яна не працавала нават спецыялістам сярэдняга звяна, не кажучы ўжо пра кіруючыя пасады. Завочна скончыла Буда-Кашалёўскі дзяржаўны аграрна-тэхнічны каледж, пасля — Беларускую дзяржаўную сельскагаспадарчую акадэмію. Сакрэты аграрнай вытворчасці спасцігала разам з калектывам і...

Праз некалькі гадоў сельгаспрадпрыемства пад началам Галіны Пятроўны ўжо моцна ўстала на ногі, пасля чаго да яго далучылі яшчэ тры гаспадаркі, эканамічны стан якіх, мякка кажучы, вымушаў жадаць лепшага. А плошча зямельных угоддзяў «Звязды» складае цяпер каля траціны ад усіх сельскагаспадарчых зямель раёна. Адпаведна каля траціны выпрабляецца і прадукцыі — мяса, малака, збожжа.

— Лідарамі аграрнай вытворчасці мы сталі дзякуючы плённай працы ўсяго калектыву, — заўважае Галіна Пятроўна. І паўжартам дадае: — А можа, і з-за таго, што я ў гэтай гаспадарцы сёмы па ліку кіраўнік, а лічба сем заўсёды лічылася магічнай. Нездарма ж сем цудаў свету, сем колераў вясёлкі, сем дзён у тыдні...

Што ж, магчыма, і ў гэтым ёсць нейкі сэнс, але ж — відавочна — і ў арганізатарскіх здольнасцях самой Галіны Пятроўны, у яе ўвазе да людзей, у тым, што яна ніколі і нікога не пакідае ў бядзе.

У калектыве ж, як вядома, здараецца ўсякае. Не сакрэт, што побач з тымі, хто працуе сумленна, сустракаюцца часам і гультаі, і п'яніцы. Іх сарамацяць, папярэджваюць, караюць і, толькі вычарпаўшы ўвесь выхаваўчы арсенал, звальняюць з работы. Што ж датычыць аматараў спіртнога, дык лечаць іх за кошт гаспадаркі. Праўда, у выпадку, калі чалавек закадзіраваўся і вытрымаў тэрмін. Калі ж сарвецца, то сродкі, патрачаныя на лячэнне, будуць вылічаны з яго заробку.

Адным з прыярытэтаў у сваёй дзейнасці як кіраўніка Галіна Пятроўна Трыбунах лічыць належна пастаўленую інфармацыйна-тлумачальную работу, фарміраванне ў працаўнікоў калектыву карпаратыўнай этыкі, унутранай культуры, духу здаровага саперніцтва.

Вынікі работы тут падводзяцца штомесячна. Перадавікоў віншуюць у прысутнасці ўсяго калектыву, ім уручаюць адзнакі пераможцаў спаборніцтва і грашовыя прэміі. Акрамя гэтага, прадугледжаны і іншыя стымулы для заахвочвання людзей да плённай працы. Напрыклад, аматарам парыбачыць прадастаўляюцца дадатковыя выхадныя, а на калектыўную юшку можа завітаць і дырэктар гаспадаркі.

Традыцыйным у плане навядзення чысціні і парадку стала правядзенне так званых санітарных пятніц, суботнікаў, дзён добраахвотнай працы. Усё гэта садзейнічае згуртаванню калектыву, натхняе яго на новыя працоўныя здабыткі. Не дзіва, што вытворчыя паказчыкі ў гаспадарцы растуць. У прыватнасці, калі ў 2013 годзе выручка ад рэалізацыі прадукцыі складала 36 498 мільёнаў рублёў, дык у 2015 годзе яна дасягнула 64 840 мільёнаў рублёў. За гэтыя тры гады вытворчасць валавой прадукцыі ў разліку на аднаго работніка павялічылася з 273,9 мільёна рублёў да 454,1 мільёна рублёў.

Найбольш паспяхова развіваецца жывёлагадоўля: у 2015 годзе прыбытак ад яе дасягнуў 7815 мільёнаў рублёў, узровень рэнтабельнасці склаў 289,5 працэнта. Такога эканамічнага росту дагэтуль не назіралася.

Дасягненні гаспадаркі з'яўляюцца надзейнай асновай для паляпшэння дабрабыту яе працаўнікоў. Сярэдні заробак тут каля 7,5 мільёна рублёў (недэнамінаваных. — **Аўт.**). У гаспадарцы па-ранейшаму будуюць жыллё, вырашаюць іншыя пытанні з так званага сацыяльнага пакета.

Павелічэнне надояў і прывагаў, рост ураджайнасці сельскагаспадарчых культур — гэта ў гаспадарцы ўжо звычайная з'ява. Новым актуальным кірункам у дзейнасці яе калектыву стала імкненне да эканоміі і беражлівасці, асабліва — энергетычных рэсурсаў.

На чале гэтай справы стала дырэктар гаспадаркі: сама па спецыяльнасці інжынер-механік, Галіна Пятроўна не толькі патрабуе ад усіх ашчаднасці ў выкарыстанні рэсурсаў, але і прапаноўвае канкрэтныя шляхі для выканання пастаўленай задачы.

Намаганні калектыву ў вырашэнні гэтага пытання не засталіся незаўважанымі. За дасягненне высокіх вынікаў у рацыянальным выкарыстанні энергетычных рэсурсаў, іх эканомію па выніках 2015 года ААТ «Звязда» занесена на абласную і рэспубліканскую Дошкі гонару.

Вось так тут жывуць і працуюць. Знешне непрыкметна, але па-сапраўднаму плённа. Між тым гаспадарка, як, дарэчы, і сам Чачэрскі раён, пасля аварыі на Чарнобыльскай АЭС знаходзяцца ў зоне радыяцыйнага кантролю. Ды людзі тут на лёс не скардзяцца. Наадварот, яны імкнуцца зрабіць сваё жыццё як мага больш цікавым і змястоўным.

Сёлетняе свята аграрыяў калектыў гаспадаркі сустракае ў добрым настроі. Як стала вядома, па выніках дзесяці месяцаў бягучага года «Звязда» чарговы раз стала пераможцай у раённым спаборніцтве па вытворчасці асноўных відаў сельскагаспадарчай прадукцыі.

**Алег ШВЕДАЎ**

# БЫЦЬ КАРЫСНЫМ СВАЁЙ КРАІНЕ





Фота Надзеі БУЖАН.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Дзмітрый Жукоўскі, як і марыў, будзе служыць у сілах спецыяльных аперацый. Павестка ў ваенкамат не стала для юнака нечаканасцю. Як выпускнік ВНУ — Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка — Дзіма будзе служыць толькі год. Па спецыяльнасці ён сацыяльны педагог, педагог-псіхолаг, таму пра вайсковую службу разважае абсалютна па-настаўніцку: «Армейская служба дысцыплінуе, трэніруе ўнутраную вытрымку. Войска дае магчымасць атрымаць прафесію, тут набываеш неабходныя ў жыцці навыкі і бясцэнны вопыт».

Суседзі па двары Ягор Гілеўскі і Дзмітрый Паўловіч нават падумаць не маглі, што апынуцца ў адной вайсковай часці, а тым больш — у 5-й асобнай брыгадзе спецыяльнага прызначэння. Таварышы і цяпер не могуць паверыць: выраслі побач, вучыліся ў адным каледжы, а цяпер і служыць будуць у адной з самых прэстыжных вайсковых часцей краіны.

— Дзіма з дзяцінства марыў стаць дэсантнікам, — кажа Ягор, сын кадравага афіцэра.

— Таму і таварыша настройваў на сілы спецыяльных аперацый, — прызнаецца Дзмітрый.

— Я проста ўвесь час хацеў скочыць з парашутам, — быццам апраўдваецца Ягор. — Разумеючы, што ў перспектыве будзе армія, прадумваў, у якіх войсках гэта магчыма.

Вядома, аднаго жадання, каб трапіць у канкрэтную вайсковую часць, мала. Але, што называецца, тут як карта лягла: па стане здароўя, а таксама па маральна-дзелавых якасцях і адзін, і другі падышлі для таго, каб служыць у спецназе.

— Так супала, што ў гэтай брыгадзе ў свой час праходзіў службу і мой бацька, — гаворыць Дзмітрый Паўловіч. — Таму на мяне ўскладзена двайная місія: быць не толькі годным абаронцам, а і дастойным сынам свайго бацькі.



— У адпаведнасці з заканадаўствам Беларусі, восенню бягучага года выкліку на прызыўныя камісіі падлягае больш 80 тысяч грамадзян нашай краіны, — адзначыў **намеснік начальніка Галоўнага арганізацыйна-мабілізацыйнага ўпраўлення Генеральнага штаба Узброеных Сіл палкоўнік Юрый КУЗЬМІН.** — Цяпер у ваенных камісарыятах завяршаецца медыцынскі агляд прызыўнікоў. Прызыўнымі камісіямі ў адносінах да грамадзян Беларусі ўжо прынята больш як 55 тысяч рашэнняў. Улічваючы патрэбу Узброеных Сіл, іншых войск і вайсковых фарміраванняў, на іх камплектаванне плануецца адправіць больш 10 тысяч прызыўнікоў. Акрамя таго, у гэты перыяд да 2 тысяч чалавек будзе адпраўлена для праходжання службы ў рэзерве. Папаўненне адпраўляем ва Узброеныя Сілы, транспартныя войскі, органы дзяржаўнай бяспекі, органы пагранічнай службы і ўнутраныя войскі Міністэрства ўнутраных спраў.

Па меркаванні намесніка начальніка Галоўнага арганізацыйна-мабілізацыйнага ўпраўлення Генеральнага штаба Узброеных Сіл, сённяшні прызыўнік — гэта патрыёт нашай краіны, малады грамадзянін прызыўнога ўзросту, які мае матывацыю да праходжання вайсковай службы, адабраны прадстаўнікамі вайсковых часцей як найбольш падрыхтаваны, зыходзячы з узроўню яго фізічнага развіцця і здольнасці выконваць пастаўленыя задачы па прызначэнні ў мірны і ваенны час.

Сёлета прадастаўлена каля 25 тысяч адтэрміновак. Асноўную частку — больш 80 % — складаюць адтэрміноўкі для працягу адукацыі. Іншыя юнакі атрымалі адтэрміноўку па стане здароўя, сямейных абставінах, для набыцця ваенна-тэхнічных спецыяльнасцей, у сувязі з ажыццяўленнем дэпутацкіх паўнамоцтваў і на падставе ўказаў Прэзідэнта краіны.

Прызыўніка Арсенія Пяткевіча ў армію праводзіць мама, бацька і хросны тата. Заўважаю, што больш за ўсіх хвалюецца маці: са сваім адзіным дзіцем так надоўга яна ніколі не разлучалася. Васямнаццацігадовы Арсеній настроены аптымістычна — служыць у войсках сувязі, на погляд хлопца, даволі цікава.

Мужчыны, якія выпраўляюць свайго сына ў армію, даюць яму каштоўныя парады і маюць на гэта права. Бацька служыў у войсках супрацьпаветранай абароны, хросны — у легендарнай 103-й гвардзейскай паветрана-дэсантнай дывізіі. «Няхай з таго вопыту, які ён атрымае ў арміі, Арсеній вынесе толькі нешта добрае і станоўчае для сябе, — жадае хроснаму сыну Анатоль Іванавіч. — У першую чаргу, трэба глядзець на армію як на магчымасць прынесці карысць сваёй краіне, стаць сапраўдным абаронцам нашай дзяржавы».

...Бацькі, сваякі і сябры развітваюцца з прызыўнікамі. У наступны раз яны ўбачацца праз месяц, падчас цырымоніі прыняцця ваеннай прысягі ў новага папаўнення, якая адбудзецца ў злучэннях і воінскіх часцях Узброеных Сіл 10 снежня.

Звальненне ў запас ваеннаслужачых, тэрміновая служба якіх ужо завяршаецца, будзе праведзена ў адпаведнасці з заканадаўствам своечасова, на працягу лістапада.

**Вераніка КАНЮТА.**
*kanyuta@zviazda.by*

**P.S. Падчас восеньскага прызыву творчая каманда «Звязды» пацікавілася ў беларусаў, што яны думаюць наконт службы ў арміі. Відэа з меркаваннямі можна паглядзець на нашым партале zviazda.by.**




# ГЭТА НЕ ІХ ВАЙНА...

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Пасля такіх слоў падрыхтаваўшыся да горшага, рушым услед за маладымі жанчынамі. Дарэчы, функцыі супрацоўнікаў упраўлення прымусовага выканання даволі шырокія. Яны маюць права апячатаць памяшканне, накласці арышт на маёмасць, канфіскаваць яе, аб'явіць даўжніка ў вышук. Службовае пасведчанне дае магчымасць бесперашкодна ўваходзіць, у тым ліку, і на прыватную тэрыторыю. Невыкананне або перашкода выкананню законных патрабаванняў спецыяліста, абраза яго гонару і годнасці, гвалтоўныя дзеянні ў дачыненні да яго цягнуць за сабой адказнасць у адпаведнасці з заканадаўчымі актамі. Судовыя выканаўцы дзейнічаюць выключна па службовай інструкцыі, так што недавер да іх з боку грамадзян нічым не апраўданы.

У першай кватэры на сігнал дамафона ніяк не рэагуюць, адкрываюць толькі пасля працяглага званка ў дзверы. На парозе — сталая жанчына ў хатнім касцюме. Супрацоўніцы паказваюць пасведчанні і праходзяць у кватэру. Неплацельшчык, доўг якога каля 3700 рублёў, таксама дома: ён збіраўся піць чай. Мужчына нідзе не працуе ўжо паўтара года. Паколькі даходаў у яго няма, ажыццяўляецца вопіс маёмасці.

— У вас асабовыя рахункі ў кватэры падзеленыя? Калі не, то мы павінны абследаваць усе пакоі, — тлумачыць парадак работы судовы выканаўца.

Як толькі гаворка заходзіць пра вопіс, ветлівая да гэтага моманту жанчына — маці даўжніка — пачынае закіпаць. «Вы ж чулі, што ён не працуе! Адкуль у яго грошы, каб што-небудзь купляць? Я сама ўсё, што тут ёсць, набывала, крэдыты выплачвала. Гэта ўсё маё!» — зрываецца яна на крык.

— Але на нейкія ж сродкі ён існуе, — заўважае Марына.

— На якія? Схадзіла ў краму, купіла прадуктаў — не вырываць жа іх у яго з рота! Вось і ўсе прыбыткі!

Нягледзячы на абурэнне жанчыны, Марына і Ірына працягваюць выконваць свае абавязкі. Спіс таго, што не падлягае вопісу, даволі вялікі. Напрыклад, у кватэры павінны застацца па адным ложку (ці тахце) і крэсле на кожную асобу, якая тут жыве, стол і шафа для адзення на сям'ю, халадзільнік. Недатыкальныя многія прадметы побыту і адзення.

Пад вопіс часцей за ўсё трапляе несастарэлая электроніка і тэхніка. Калі атрымліваецца давесці, што купля была здзейсненая іншым членам сям'і, яна ў спіс не ўключаецца.

Пральная машына, 2 тэлевізары, камп'ютар, мульціварка... Як толькі прадметы, якія падлягаюць вопісу, названыя, пачынаецца пошук дакументаў.

— Усё жыццё працавала. Выйшла на пенсію — на табе. Прыйшлі забіраць! За што мне ўсё гэта? — не стамляецца галасіць жанчына.

— Мама, супакойся! Яны проста выконваюць сваю работу, — спрабуе суцішыць яе сын, які, дарэчы, ні на секунду не губляе самавалоданне. — Я ўсё разумею. Але я ж не ўхіляюся ад выплаты аліментаў. Проста так склаліся абставіны. Нядаўна вось 100 рублёў адправіў. Як толькі з'яўляецца магчымасць, адразу ж дапамагаю, — дзеліцца набалелым мужчына. — Але мяне пасля турмы нідзе не бяруць!

Як толькі даведваемся, што гэты інтэлігентны па манерах чалавек адбываў пакаранне за забойства, у паветры пачынае лунаць напружанне. Ад працяглай паўзы ўсіх пазбаўляе яго маці, якая вяртаецца з дальніх пакояў: «Не магу я знайсці дакументы на гэты тэлевізар! Тэлефануйце мне на працу — у мяне крэдыт з зарплаты спісвалі, у ГУМ, прабіце ў рэшце рэшт па сваёй электроннай базе».

— Гэта не ў нашай кампетэнцыі. Цяпер мы ўносім яго ў спіс, а вы на працягу 10 дзён, калі знойдзеце доказы, што набывалі тэлевізар на свае сродкі, можаце выключыць яго адтуль праз суд Ленінскага раёна.

У выніку ў пераліку застаюцца толькі гэты «спрэчны» тэлевізар і мульціварка, якая калісьці даўно была набыта цяперашнім даўжніком: пра гэта сведчыць яго подпіс.

— Усё ёй (нявестцы) мала. Адзін камп'ютар ёй аддала, халадзільнік. Не хапае? Ды калі ласка, усё забірайце! Вось ката. Ён нашмат пацягне? Ну ўсё, пухнаты, рыхтуйся да пераезду, — ужо з-за дзвярэй даносяцца да нас воклічы жанчыны.

Перавёўшы дух, пытаемся ў судовых выканаўцаў, якія і брывом не павялі падчас усёй «драмы»: і што — так заўсёды?

— Ды гэта мы яшчэ вельмі лёгка абышліся, — усміхаецца Марына.

Накіроўваемся па наступным адрасе. На званок зноў выходзіць жанчына прыблізна аднаго з папярэдняй «гераіняй» узросту. Першапачаткова яна ставіцца да візіту з падазрэннем, а калі даведваецца пра яго прычыну, і наогул губляе над сабой кантроль. «Бясчынства! Гэта сапраўднае бясчынства! Ды як вы смееце? Калі б я ведала, ні за што б не пусціла вас на парог!» Далей ідзе ўжо знаёмая тырада пра тое, што яны з мужам усё гэта зараблялі на працягу жыцця. Спачатку яна гатовая пусціць супрацоўніц упраўлення юстыцыі выключна ў спальню сына-даўжніка, які, дарэчы, «пайшоў у госці да сябра», але пасля адмаўляецца і ад гэтай ідэі, спрабуючы загарадзіць сабой дзверы адразу ва ўсе пакоі. Не рэагуючы на спакойныя просьбы даць магчымасць прыступіць да работы, жанчына пачынае тэлефанаваць мужу: «Прыязджай хутчэй! У нас тут трагедыя!» Далей ідзе, відаць, падгледжанае ў фільмах: «Я не буду размаўляць без парады свайго адваката». Пасля званкоў — выключна крык. Адны з самых мяккіх фраз «Сумлення ў вас няма» і «Пабойцеся Бога». Дзяўчатам не застаецца нічога, акрамя як выклікаць супрацоўнікаў міліцыі. Пакуль яны дабіраюцца да месца, жанчына паступова супакойваецца і нават дазваляе пачаць агляд.



Фота Надзеі БУЖАН.

**Пад вопіс часцей за ўсё трапляе несастарэлая электроніка і тэхніка. Калі атрымліваецца давесці, што купля была здзейсненая іншым членам сям'і, яна ў спіс не ўключаецца.**

Камп'ютар, тэлевізары, пыласос — стандартны набор тэхнікі для кожнай кватэры. На паліцы — пячатка індывідуальнага прадпрымальніка. Аднак ні прадпрымальніцкую, ні любую іншую працоўную дзейнасць неплацельшчык даўно не вядзе. «Чаму не працуе? Спытайце ў яго. Гэта мой цяжкі крыж!» — нечакана ўздыхае жанчына. Такая магчымасць неўзабаве ўзнікае: услед за супрацоўнікамі міліцыі ў кватэры з'яўляецца той самы даўжнік. З парога — адразу ў атаку, маўляў, чаго прыйшлі? На выплаты дзецям, якіх у яго, дарэчы, двое, ён павінен суму больш 17 000 рублёў.

— Імя і прозвішча былой жонкі? — задае пытанне судовы выканаўца.

— Паняцця не маю, пра што вы кажаце. Няма яе ў мяне і ніколі не было. А гэтая так, ерунда... — махае рукой мужчына. Ад дзяцей, доўга ўспамінаючы гады іх нараджэння, ён таксама адхрышчваецца, у яшчэ больш грубых выразах.

Сумы, вырučaнай ад продажу апісаных прадметаў, не хопіць, каб пакрыць і дзясятую частку доўгу. Хутчэй за ўсё ў лік доўгу прыйдзецца забраць аўтамабіль.

— Хто-небудзь з жыхароў кватэры на перыяд, пакуль будзе вынесена канчатковае рашэнне, з'яўляецца захавальнікам апісаных рэчаў: ён нясе адказнасць за іх цэласнасць. Пасля яны перадаюцца рэалізуючай арганізацыі, напрыклад у камісійную краму. Выручка ідзе на пагашэнне доўгу, — расказвае Марына. — Калі чалавек не хоча расставацца са сваёй маёмасцю, ён можа пакрыць яе кошт грашыма. Мы займаемся пераважна беспрацоўнымі, паколькі ў астатніх, у выпадку неаплаты, сума вылічваецца з зарплаты і складае не менш за 25% ад прыбытку на адно дзіця, 33% на двух дзяцей і 50% на трох і больш дзяцей. Асобы, якія страцілі працу, першыя тры месяцы выплачваюць аліменты па агульных правілах ад памераў заробку на апошнім месцы. Далей сума разлічваецца ў залежнасці ад велічыні сярэдняй заработнай платы па рэгіёне. На цяперашні момант у Мінску яна складае каля 183 рублёў на адно дзіця штомесяц.

Па назіраннях спецыялістаў, добрасумленныя плацельшчыкі аліментаў — з'ява не занадта распаўсюджаная. Мужчыны альбо не плацяць наогул, альбо шукаюць спосабы, як звесці суму да магчымага мінімуму. У канфліктных сітуацыях ёсць толькі грошы і спрэчкі з былой жонкай. І пра дзяцей ні слова...

**Дар'я КАСКО.**
*kasko@zviazda.by*

■ Узровень

## СЭРЦА-ЛЁГКІЯ ПЕРАСАДЗІЛІ МАЛАДОМУ МУЖЧЫНЕ

**Трансплантацыя комплексу «сэрца-лёгкія» ўпершыню была праведзена 2 лістапада ў Рэспубліканскім навукова-практычным цэнтры «Кардыялогія». Раней у краіне ўжо траім пацыентам перасаджвалі комплекс «сэрца-ныркі».**

Беларускія кардыяхірургі стажыраваліся дзеля гэтага ў Гановерскім цэнтры, які з'яўляецца сусветным лідарам у галіне трансплантацыі лёгкіх і комплексу «сэрца-лёгкія». Штогод у цэнтры выконваецца каля 150 трансплантацый лёгкіх і каля 10—15 — адразу двух органаў. Паводле слоў **кардыяхірурга РНПЦ «Кардыялогія» Сяргея СПІРЫДОНАВА,** заняцца перасадкай менавіта такога комплексу прымусіла жыццё. З 2009 года ў краіне праводзяцца трансплантацыі сэрца ў пацыентаў з сардэчнай недастатковасцю, аднак ёсць пацыенты, якім толькі такая аперацыя не можа дапамагчы. Гэтыя людзі вельмі доўга жылі з прыроджаным або набытым парокам сэрца, што прыводзіць у выніку да высокай лёгачнай гіпертэнзіі. Замена аднаго толькі сэрца тут не ратуе, што і абумовіла неабходнасць падрыхтоўкі да новага віду перасадкі.

Да работы падключылася вялікая колькасць урачоў пад кіраўніцтвам акадэміка Юрыя Астроўскага. Аперацыя, да якой былі прыцягнутыя каля 20 чалавек, доўжылася з 13 да 22 гадзін. Пацыенту — 32 гады, у ліст чакання ён трапіў у сакавіку. Донар у дадзеным выпадку павінен быў адпавядаць па многіх параметрах, у тым ліку па росце і вазе. Цяпер пацыент знаходзіцца ў спецыяльнай палаце, наперадзе ў яго працяглая рэабілітацыя.

У чарзе на правядзенне падобнай аперацыі — 15 чалавек з прыроджанымі і набытымі парокамі сэрца, лёгачнай гіпертэнзіяй, а таксама з тромбаэмбаліяй.

**Святлана БАРЫСЕНКА.** *protas@zviazda.by*

■ На слыху

## Затрыманы старшыня Бабруйскага гарвыканкама

**Следчым камітэтам распачата крымінальная справа ў дачыненні да старшыні Бабруйскага гарадскога выканаўчага камітэта. Яна заведзена па частцы 3 артыкула 430 (атрыманне хабару асобай, якая займае адказную пасаду) Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь.**

Весці крымінальную справу даручана галоўнаму ўпраўленню па расследаванні злачынстваў у сферы арганізаванай злачыннасці і карупцыі цэнтральнага апарата Следчага камітэта. Падазроны затрыманы, з ім працуюць следчыя. У цяперашні час вырашаецца пытанне аб прымяненні да службовай асобы меры затрымання, гаворыцца на сайце Следчага камітэта. «Старшыня Бабруйскага гарвыканкама цягам доўгага часу атрымліваў ад прадстаўнікоў суб'ектаў гаспадарання і грамадзян буйныя сумы грошай у рублях і замежнай валюце. Хабар даваўся за спрыяльнае вырашэнне пытанняў, што ўваходзілі ў яго кампетэнцыю», паведамілі ва ўпраўленні інфармацыі і грамадскіх сувязяў Міністэрства ўнутраных спраў.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

# КАМЕНДАНТ МАСКВЫ КУЗЬМА СІНІЛАЎ

**Савецкі час вызначаўся адной, сапраўды фенаменальнай уласцівасцю — уменнем забываць. Жыве сабе чалавек — дзейсны, паважаны і шанаваны ў грамадстве і ўладай. Імя ва ўсіх на слыху. І раптам: няма чалавека. І ніякіх табе тлумачэнняў, каментарыяў. Як быццам і не было яго зусім.**

*Яскравы прыклад — Кузьма Раманавіч Сінілаў.*

*Усё жыццё, як сцвярджаў савецкі пастулат, «быў аддадзены справе партыі і ўрада», ніколі не знаходзіўся ні ў якіх апазіцыях, ні да каго не прымыкаў, нікому не здраджваў. Калі і «вагаўся», то толькі з лініяй партыі. Але аднойчы здарылася тое, што адбывалася ў тыя гады з усялякім больш-менш прыкметным чалавекам — ён стаў не патрэбны. Ні гэтай самай партыі, ні таму ж ураду.*

*І хоць да таго часу (восень 1953-га) у краіне наступіла «адліга», не было ўжо славутага «культу асобы» і сам яго натхняльнік пакінуў гэты свет, з Сінілавым паступілі па ранейшых, адпрацаваных правілах — выкінулі як непатрэбную рэч, якая сваё адслужыла.*



## ПЕРШЫЯ ЎНІВЕРСІТЭТЫ: У ПАРАБКАХ

Кузьма Раманавіч Сінілаў нарадзіўся ў богам забытай беларускай вёсцы Бывалькі Лоеўскай воласці Рэчыцкага павета ў 1902 годзе. Сям'я, якая складалася з сямі чалавек, мела ўсяго паўтары дзесяціны зямлі: паўдзесяціны ворнай і дзесяціну сенакосных угоддзяў. Сена ледзь хапала, каб пракарміць зімой каня і карову. Свой хлеб добра калі меўся да Каляд. Таму бацька Раман Сінілаў і старэйшы брат Віктар, як толькі пачынаў звінець вясновы капеж, сыходзілі з вёскі на заробкі — сплаўляць лес.

Лес сплаўлялі па малых рэках да іх вусцяў (на Бярэзіну ці Прыпяць), там вязалі плыты, а затым гналі іх на Днепр і далей — уніз, часам да самага Кіева. Вярталіся ў вёску звычайна позняй восенню. У летні гарачы час вясковай гаспадаркай кіравала маці. Яна сама арала, сеяла жыта і авёс, касіла сена. У палявых работах ёй дапамагалі меншыя дзеці — Кузьма і Марыя. Зімой Кузьма вучыўся ў трохкласнай сельскай школе. У дзевяць гадоў хлопец ужо батрачыў у мясцовых кулакоў. Спачатку пасвіў жывёлу, а калі падрос, стаў араць зямлю, касіць траву, малаціць збожжа на таку, секчы дрэвы ў лесе. Дарослых парабкаў у тую пару ў вёсцы амаль не засталося, іх мабілізавалі ў армію — ішла першая сусветная вайна.

У 1916 годзе ў Лоеве пачалося будаўніцтва драўлянага маста праз Дняпро. На будоўлю сагналі сотні мясцовых жыхароў. У іх ліку апынуўся і Казьма (так яго звалі ў вёсцы) Сінілаў — рослы, фізічна моцны чатырнаццацігадовы падлетак. Вазіў на тачцы грунт для насыпу, падносіў бярвёны і дошкі.

На будаўніцтве пераправы Кузьма прарабіў да позняй восені сямнаццатага года. Гэты перыяд адыграў у яго жыцці вельмі вялікую ролю. Юнак спазнаў, што такое сумесная праца, сустрэў шмат новых для сябе людзей — гарадскіх майстравых. Ад некаторых з іх пачуў смелыя прамовы: пра тое, што трэба пакончыць з вайной, што вось добра — скінулі цара, трэба ўзяцца і за памешчыкаў, зямлю аддаць сялянам... Тут, на будоўлі, Кузьма даведаўся і пра тое, што ў Петраградзе рабочыя, матросы і салдаты ўзялі ўладу ў свае рукі, стварылі новы, рабоча-сялянскі ўрад на чале з Леніным.

З гэтай весткай юнак вярнуўся ў роднае сяло. «А хто такі Ленін?» — пыталіся яго сябры, вясковыя хлопцы. Што ён мог адказаць? І сам толкам не ведаў, хто такі Ленін, хто такія бальшавікі.

Неўзабаве да вёскі дайшлі чуткі, што ў Рэчыцу, ды, як быццам бы і ў Лоеў, прыйшлі немцы, адбіраюць у сялян жывёлу і хлеб. Мужыкі захваляваліся і, калі прыйшла вясна, вырашылі схаваць быдла ў лясным урочышчы. Пасвіць грамадскі статак даручылі некалькім маладым хлопцам, у тым ліку і Сінілаву.

Вярнуўся Кузьма са статкам у сяло перад першым снегам. Да таго часу салдаты-франтавікі арганізавалі тут групу самаабароны для аховы вёскі і абароны сялян ад рабаванняў нямецкіх рэквізіцыйных атрадаў. Кузьма ўступіў у атрад. Яму выдалі вінтоўку-драгунку і пятнаццаць патронаў, сталі, як і іншых, пасылаць на дзяжурства, па-вайсковаму — «у нарад». Не маючы цёплага абутку і адзення, Кузьма мёрз у нарадах за ваколіцай вёскі, але трываў, чым набыў павагу бывалых салдат, якія хапілі нямала ліха за чатыры гады акопнага жыцця.

Неяк ноччу атрад самаабароны вёскі Бывалькі сышоў у Лоеў. Кузьму, аднак, з сабой не ўзялі. Патлумачылі:

— Куды ты, разуты і распрануты, пойдзеш у мароз?!

Як ні горка было Кузьме, але, што зробіш, давялося застацца дома. Праз тыдзень ён даведаўся, што вясковы атрад уліўся ў часць Чырвонай Арміі і пайшоў на фронт.

## ЧЫРВОНАЯ АРМІЯ ДАЛА ПУЦЁЎКУ

«Толькі з надыходам цяпла, увесну 1919 года, — пісаў Кузьма Раманавіч пазней у аўтабіяграфіі, — напаўраспрануты і басаног сышоў я добраахвотна ў Чырвоную Армію і ўступіў у асобны батальён Асаблівага корпуса войск Надзвычайнай Камісіі».

Мара здзейснілася. Першы месяц малады чырвонаармеец вучыўся хадзіць у страі, разбіраць і збіраць вінтоўку, страляць, дзейнічаць штыком і прыкладам, кідаць гранату.

Часу на вывучэнне ваеннай справы не хапала. Чырвонаармейцы займаліся ўрыўкамі паміж аблавамі на бандытаў і начным патруляваннем вуліц.

Баявое хрышчэнне чырвонаармеец Кузьма Сінілаў прыняў у суседняй Украіне ў сутычках з пятлюраўцамі, кулацкімі мяцежнікамі з банд Ангела і Зялёнага. Ужо тады Сінілаў зарэкамендаваў сябе адважным і рашучым салдатам.

У канцы ліпеня чэкісцкі батальён быў накіраваны на фронт. У цяжкіх абарончых баях з белагвардзейцамі зноў вызначыўся хлопец. За смеласць і кемлівасць ён быў прызначаны памочнікам камандзіра ўзвода.

Вясной 1920 года Кузьма Сінілаў у складзе чэкісцкага батальёна адважна ваяваў супраць белапалякаў на Мазырскім напрамку. Ужо летам камандзір батальёна запрасіў Кузьму ў сваю зямлянку для сур'ёзнай размовы. Камбат павёў гаворку пра тое, што хоць белапалякаў і пагналі з Мінска, але ваяваць яшчэ давядзецца за Савецкую ўладу доўга — і на захадзе, і на поўдні, і на ўсходзе, што Чырвонай Арміі патрэбныя свае кадравыя камандзіры з рабочых і сялян. Спачатку Сінілаў не зразумеў, да чаго хіліць камбат, але, калі той сказаў, што ёсць магчымасць адправіцца вучыцца на камандныя курсы, з радасцю пагадзіўся.

Праз дзесяць дзён ён ужо быў залічаны на Другія Маскоўскія пяхотныя курсы. Шэсць месяцаў напружанай вучобы праляцелі хутка. Набліжаўся выпуск курсантаў, прызначаны на 23 лютага 1921 года, — Дзень Чырвонай Арміі. Але напярэдадні гэтай падзеі Кузьму Сінілава ў ліку некалькіх іншых курсантаў-франтавікоў адкамандзіравалі для працягу вучобы ў Першую савецкую аб'яднаную школу РСЧА імя УЦВК.

Большасць крамлёўскіх курсантаў былі, як і Сінілаў, маладымі людзьмі, якія, аднак, прайшлі школу франтоў грамадзянскай вайны. Разам з ваеннымі дысцыплінамі курсанты вывучалі і агульнаадукацыйныя: рускую мову, матэматыку, геаграфію, гісторыю, грамадазнаўства. Для курсантаў, якія, як і Сінілаў, валодалі граматай самае большае ў аб'ёме трох класаў, гэта было проста неабходна.

Кузьма аказаўся ўпартым і працавітым. Каб папоўніць недахоп агульнай адукацыі, ён усе вольныя гадзіны (а іх было мала, шмат часу займала каравульная служба, кавалерыйская падрыхтоўка і догляд за канём) аддаваў заняткам па самападрыхтоўцы.

Дысцыплінаваны, прыкладны ў вучобе курсант быў у канцы першага навучальнага года прызначаны старшым па класе. Камандаванне кавалерыйскага дывізіёна рэкамендавала «курсанта Сінілава К. для нясення каравульнай службы на найбольш адказных пастах аховы Крамля», у тым ліку і на пасту № 27, ля дзвярэй крамлёўскай кватэры Уладзіміра Ільіча Леніна.

У сваіх успамінах Кузьма Раманавіч расказаў пра тое, што яму давялося не раз стаяць на пасту ля кватэры Леніна, бачыць кіраўніка Саўнаркама і нават размаўляць з ім:

*— Калі ішоў упершыню вартавым на пост № 27, вельмі хваляваўся. Пост гэты знаходзіўся ў канцы скляпенчатага калідора. Змяніў я ранейшага паставога і застаўся адзін. А мозг свідруе адна думка: пазнаю я Леніна ці не? Да гэтага бачыць мне яго не даводзілася. Прайшло паўгадзіны, можа, больш. Бачу, ідзе па калідоры сярэдняга росту, каржакаваты, рыжаваты чалавек у чорным гарнітуры, пры гальштуку. Хутка так ідзе. Падышоў, кажа:*

*— Добры дзень, таварыш.*

*Паказвае пропуск і пытаецца:*

*— Першы раз на гэтым пасту?*

*— Першы, — кажу, — таварыш Ленін. (У тым, што гэта — ён, я ўжо не сумняваўся...)*

У іншы раз Ленін, павітаўшыся — а ён заўсёды вітаўся з вартавымі, — спыніўся і спытаў:

— Як вучыцеся, таварыш?

— Стараюся не адставаць, хоць і цяжка мне, Уладзімір Ільіч.

— А чаму цяжка?

— Агульных ведаў мала, адукацыя — тры няпоўныя класы сельскай школы.

— Дык вы з сялян? Адкуль прыбылі?

— З Гомельскай губерні Рэчыцкага павета.

Ленін пацікавіўся, што пішуць з вёскі. Я расказаў. Уладзімір Ільіч падзякаваў, а развітваючыся, падбадзёрыў мяне: цяжкасцяў у вучобе не бойцеся, было б жаданне вучыцца.

На ўсё жыццё Кузьма Раманавіч запомніў гэтыя словы...

У 1924 годзе адбыліся выпускныя экзамены. Кузьма Сінілаў скончыў школу па першым разрадзе. З нагоды выпуску чырвоных камандзіраў адбыўся парад школы на Краснай плошчы. Прымаў парад сам старшыня ЦВК М.І. Калінін. Усесаюзны староста цёпла павіншаваў выпускнікоў. У сваім наказе чырвоным камандзірам Міхаіл Іванавіч сказаў:

— Ні далёкасць адлегласці, ні перашкоды да зносін з роднымі, ні вашы асабістыя інтарэсы не перашкодзяць вам заўсёды выконваць свой доўг. Думка, што вы служыце сусветнаму пралетарыяту, будзе заўсёды вас аб'ядноўваць, дасць вам магчымасць, дзе б вы ні былі, усведамляць сябе членамі пралетарскай сям'і... Кузьму Сінілава асабліва кранулі словы «ні далёкасць адлегласці» і «дзе б вы ні былі». Яму здавалася, што з гэтымі словамі Калінін звяртаецца асабіста да яго, Сінілава, які атрымаў прызначэнне на Далёкі Усход.

## АД ЗАБАЙКАЛЛЯ ДА ЗАПАЛЯР'Я

Спачатку яго баявое майстэрства выкоўвалася ў радах легендарнай АЧДУА — асобай Чырванасцяжнай Далёкаўсходняй арміі. Малады, адважны камэск паспяхова праявіў сябе падчас канфлікту на Кітайска-Усходняй чыгунцы, за ўмелыя і рашучыя дзеянні, а таксама за асабістую мужнасць і адвагу быў узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга. Прадстаўленне падпісаў камандарм Васіль Блюхер.

Сустрэлася і спадабалася Кузьме стройная смуглявая дзяўчына Рая Бондар. І Раі прыйшоўся па душы падцягнуты чырвоны кавалерыст. Маладыя людзі пакахалі адзін аднаго. Кузьма стаў наведваць домік у прыстанцыйным пасёлку, пазнаёміўся з бацькам Раі і братамі, што працавалі на чыгунцы. З добрай згоды родных Кузьма і Рая ў 1925 годзе пабраліся шлюбам. За вясельным сталом Сінілаў, каб не пакрыўдзіць сваякоў нявесты і гасцей, выпіў адзіную ў сваім жыцці чарку разведзенага спірту. Да і пасля вяселля, як пішацца ва ўспамінах, ён ніколі не піў нічога са спіртнога і не курыў.

У снежня 1927 года Кузьму Сінілава прызначаюць камандзірам эскадрона 81-га Забайкальскага палка той жа брыгады. Турбот і клопатаў па службе разам прыбавілася.

Раіса Фёдараўна, як і ўсе жонкі камандзіраў, ведала, што калі муж без папярэджання не вярнуўся да ночы дахаты, значыць, на мяжы неспакойна, значыць, эскадрон, а то і ўвесь полк па трывозе пайшоў у паход.

Баявая і палітычная вучоба, доўгія пераходы па Усурыйскай тайзе, імклівыя пагоні і жорсткія сутычкі з парушальнікамі мяжы — такія былі службовыя будні кавалерыстаў-далёкаўсходнікаў. У іх гартавалася воля Сінілава, адточвалася яго воінскае майстэрства. У чарговай атэстацыі камандзір палка адзначае, што «тав. Сінілаў у паходах вынослівы», што «эскадрон Сінілава — лепшы ў брыгадзе».

У лістападзе 1928 года К.Р. Сінілаў «за дасягненні ў баявой падрыхтоўцы эскадрона, праяўленую ініцыятыву і смеласць у баявых аперацыях» атрымаў чарговую ўзнагароду. Яму ўручылі ганаровую баявую зброю — пісталет сістэмы «маўзер».

За доўгія месяцы разам з памежнікамі Кузьме Раманавічу спадабалася іх служба. На многіх заставах у яго з'явіліся добрыя сябры і таварышы. У канцы 1930 года К.Р. Сінілаў пераходзіць у памежныя войскі АДПУ. Спачатку ён служыць камандзірам кавалерыйскага дывізіёна, затым прызначаецца памочнікам камандзіра 9-га палка войск АДПУ.

Да свайго трыццацігоддзя Кузьма Раманавіч прыйшоў вопытным кадравым камандзірам. У 1933-м камандаванне войскаў АДПУ Усходне-Сібірскай акругі рэкамендавала К.Р. Сінілава на вучобу ў Ваенную акадэмію РСЧА імя М.В. Фрунзе, якую ён бліскуча, з дыпломам першай ступені, скончыў у 1936-м. У яго атэстацыі гаварылася: «К.Р. Сінілаў — валявы і рашучы камандзір, добра разбіраецца ў аператыўна-тактычнай абстаноўцы. Да работы ў войсках падрыхтаваны выдатна».

Тым часам японцы рыхтаваліся да новых правакацый на мяжы.



Гістарычны парад 7 лістапада 1941 г.

**Ваенны камендант Масквы Кузьма Раманавіч Сінілаў выйшаў з агаломшаным старшым лейтэнантам у двор і асабіста паказаў, як трэба будзе кідаць сцягі, беручы ў рукі і з сілай кідаючы двухметровыя драўляныя распоркі ад палатак.**

8 лютага 1939 года Галоўнае ўпраўленне пагранічных войск інфармавала НКУС СССР: «Па дадзеных пагранатрада тав. Сінілава, японцы рыхтуюць на сухапутным участку пагранатрада правакацыю сіламі пяхотнага батальёна, дыслакаванага ў Маньчжурыі, пры падтрымцы мотамехчасцей. Нашы пагранічныя атрады прыведзены ў баявую гатоўнасць на небяспечным участку, мяжа ахоўваецца ўзмоцненымі нарадамі; за маньчжурскай тэрыторыяй вядзецца камандзірскае назіранне».

Пасля лютаўска-сакавіцкіх правакацый на Забайкальскай мяжы, якія мелі мэтай адцягнуць увагу ад падрыхтоўкі ўдару супраць МНР, японцы ў маі справакавалі ваенны канфлікт на мяжы з Мангольскай Народнай Рэспублікай у раёне ракі Халхін-Гол. Вядома і чым скончылася гэтая правакацыя. Часці Чырвонай Арміі і Народна-рэвалюцыйнай арміі МНР ушчэнт разбілі тут войскі мілітарыстаў.

Кузьма Сінілаў у гэтых падзеях ужо не ўдзельнічаў. Яго тэрмінова выклікалі ў Маскву.

Сталіца сустрэла яго шматлюднасцю, шумам і гоманам, ад якіх за два гады ў Забайкаллі паспеў адвыкнуць. Ён пагуляў па вуліцы Горкага. За гмахам новага Дома Саўнаркама выраслі агромністыя карпусы жылых дамоў. Калі Сінілаў ад'язджаў з Масквы, яны яшчэ толькі будаваліся. Кузьма Раманавіч падняўся да Пушкінскай плошчы. На будынку «Известий», абганяючы адна адну, беглі, складаючыся ў словы і фразы, літары светлавой газеты. Прачытаўшы некалькі апошніх паведамленняў, Сінілаў нахмурыўся. Навіны былі трывожнымі. Сапраўды, небяспека вайны ў Еўропе да пачатку 1939 года значна ўзмацнілася. Фашысцкая Германія акупавала Чэхію, справакавала данцыгскі інцыдэнт, пагражаючы Польшчы, захапіла літоўскую Клайпеду. Урад Фінляндыі, які рухаўся ў фарватэры фашысцкай палітыкі, пачаў ваенную падрыхтоўку ля мяжы з СССР.

Першага красавіка палкоўнік К.Р. Сінілаў адбыў да месца сваёй новай службы — у Мурманск.

Ваеннае сутыкненне з Фінляндыяй было непазбежным. Справа да гэтага ішла ўжо даўно. Пазней Сінілаў так дакладваў камандаванню:

Прыбыццё ў Маскву прэм'ер-міністра Вялікабрытаніі У. Чэрчыля. Злева-направа: У.Р. Дзеканозаў, В.М. Молатаў, К.Р. Сінілаў, Б.М. Шапашнікаў. 1942 г.



«Яшчэ з вясны 1939 года фіны ўзмоцнена прыступілі да ваенізацыі цывільнага насельніцтва ў памежнай паласе, актывізавалася антысавецкая прапаганда. Ваенныя і іншыя мерапрыемствы фінскага ўрада ў памежнай паласе з незвычайнай хуткасцю ўзмацніліся пасля таго, як Чырвоная Армія перайшла савецка-польскую мяжу». Фінляндыя, перапыніўшы перамовы з Савецкім Саюзам аб змене лініі праходжання мяжы пад Ленінградам, правяла ўсеагульную мабілізацыю і разгарнула свае войскі на мяжы з СССР. У канцы лістапада пачалася вайна.

Спецыяльна сфарміраваная пагранічная рота разам з часцямі Чырвонай Арміі і караблямі Паўночнага флоту ўжо 1 снежня 1939 года вызваліла Пячэнгу. У перыяд актыўных дзеянняў памежнікаў Сінілаў і камісар акругі Скарадумаў, абодва выдатныя спартсмены, прайшлі на лыжах амаль па ўсёй мяжы акругі, пабывалі на ўсіх сухапутных заставах. Як успамінаў камісар, Кузьма Раманавіч «дзясяткам разведвальных груп, якія адпраўляліся з застаў у глыбокі тыл праціўніка, асабіста ставіў баявую задачу, старанна інструктаваў, звяртаючы асаблівую ўвагу на арганізацыю баявога ахоўвання ў паходзе і на прывалах, захаванне здароўя і жыцця асабовага складу, патрабаваў хуткай, неадкладнай перадачы сабраных разведдадзеных».

Вайна з фінамі завяршылася вясной 1940 года. Перад памежнікамі Запаляр'я і іх начальнікам К.Р. Сінілавым, якому ў хуткім часе было прысвоена генеральскае званне, былі пастаўленыя чарговыя важныя задачы: арганізацыя аховы новай мяжы на паўастравах Сярэднім і Рыбачым, на Кандалакшскім напрамку, фарміраванне новых атрадаў і застаў. І зноў будаўніцтва, будаўніцтва, будаўніцтва...

Гэтыя задачы былі таксама паспяхова вырашаны. Генерал-маёр Сінілаў быў узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.

## ВАЕННЫ КАМЕНДАНТ

Кажуць, мяжа — гэта барометр адносін паміж суседнімі дзяржавамі. Пачынаючы з мая 1941 года стрэлка гэтага барометра няўхільна перамяшчалася да адзнакі «бура».

У Музеі памежных войскаў захоўваецца характэрны дакумент. «Агляд баявых дзеянняў пагранвойскаў Мурманскай акругі з 22.6 па 1.12 1941 года». У аглядзе, у прыватнасці, гаворыцца, што з 7 ліпеня па 1 снежня памежныя часці акругі здзейснілі 70 рэйдаў па тылах праціўніка, у тым ліку ў складзе палка (пагранатрада) тры рэйды, у складзе батальёна — шэсць і ў складзе роты — дванаццаць. На глыбіню звыш 200 кіламетраў ажыццёўлены два рэйды, ад 100 да 200 кіламетраў — тры рэйды, ад 60 да 100 кіламетраў — 65 рэйдаў... Як успамінаў затым Сінілаў, трэба было прымусіць немцаў пастаянна дрыжэць за свой тыл. Нашы памежнікі, якія прывыклі дзейнічаць дробнымі групамі і самастойна вырашаць баявыя задачы, былі добра падрыхтаваны для дзеянняў у варожым тыле лепш, чым хто-небудзь.

У жніўні 1941-га Кузьму Раманавіча выклікалі ў Маскву. Тут яму даручылі фарміраванне 2-й асобнай дывізіі спецыяльнага прызначэння войск НКУС. У дывізію ўвайшлі асобныя часці і навучальныя ўстановы пагранічных і ўнутраных войск, расквартараваных у Маскве і Падмаскоўі, у тым ліку Вышэйшая пагранічная школа, Пагранічнае вучылішча імя В.Р. Мянжынскага, часці па ахове прамысловых прадпрыемстваў і іншыя. Байцы дывізіі неслі гарнізонную службу, ахову парадку і абаронных аб'ектаў.

Восенню 1941 года вораг выйшаў на дальнія подступы да Масквы. Над сталіцай навісла грозная небяспека. Па рашэнні Дзяржаўнага Камітэта Абароны пачалася эвакуацыя з горада заводаў, навуковых і культурных каштоўнасцяў, залатога запасу. Гэтыя мерапрыемствы праводзіліся хутка. Але разам з арганізаванай эвакуацыяй пачаліся і стыхійныя ўцёкі часткі насельніцтва, якое паддалося правакацыйным чуткам, што распаўсюджваліся варожай агентурай, аб нібыта немінучай здачы Масквы.

Часці дывізіі Сінілава трымалі парадак у горадзе. Але ў сталіцы па-ранейшаму было трывожна. Немцы цяпер здзяйснялі паветраныя налёты не толькі па начах, але і днём, што ўзмацніла трывогу жыхароў. 17 кастрычніка па Маскоўскай гарадской радыёсетцы выступіў сакратар Цэнтральнага і Маскоўскага камітэтаў партыі Аляксандр Сяргеевіч Шчарбакоў. Ён растлумачыў масквічам складанасць становішча на Заходнім фронце, вымушанасць і мэтазгоднасць эвакуацыі. Разам з тым А.С. Шчарбакоў абверг чуткі аб быццам бы рыхтуемай здачы сталіцы: «За Маскву будзем біцца ўпарта, люта, да апошняй кроплі крыві. Планы гітлераўцаў мы павінны сарваць што б там ні было».

Былы член Ваеннага савета Маскоўскай ваеннай акругі і Маскоўскай зоны абароны К.Ф. Цялегін успамінаў: «Прынятыя меры па падтрыманню парадку і спакою ў горадзе, мабыць, прынеслі б свае вынікі, але паток параненых з фронту, які ўзмацняўся з кожным днём, бежанцаў з заходніх раёнаў рабілі нашы намаганні недастаткова эфектыўнымі. Абстаноўка патрабавала ўжо іншых, больш суровых мер ваеннага часу...»



Парад Перамогі 24 чэрвеня 1945 г.

І яны былі прынятыя. Увечары 19 кастрычніка камандуючы і члены Ваеннага савета Маскоўскай ваеннай акругі былі выкліканыя на пасяджэнне Дзяржаўнага камітэта абароны. На гэтым жа пасяджэнні было вырашана прызначыць генерал-маёра К.Р. Сінілава ваенным камендантам Масквы. Калі Сталіну прадставілі кандыдатуру новага ваеннага каменданта, правадыр толькі пацікавіўся:

— Чаму менавіта ён?

— Усе воінскія падраздзяленні, — растлумачылі Сталіну, — якімі камандаваў Сінілаў, — узорныя па частцы дысцыпліны і парадку.

На наступны дзень за подпісам Сталіна з'явілася вядомая пастанова Дзяржаўнага Камітэта Абароны «Сим объявляется...».

Гэтым дакументам прадпісвалася, што ў сталіцы абвяшчаецца асаднае становішча, яе абарона даручана камандуючаму Заходнім фронтам генералу Жукаву, а «ахова найстражэйшага парадку ў горадзе і ў прыгарадных раёнах — на каменданта горада Масквы генерал-маёра Сінілава. Парушальнікаў парадку неадкладна прыцягваць да адказнасці з перадачай суду ваеннага трыбунала, а правакатараў, шпіёнаў і іншых агентаў ворага, якія заклікаюць да парушэння парадку, расстрэльваць на месцы...».

Можна шмат і доўга расказваць, як наводзіўся ў Маскве парадак. Спашлёмся толькі на адно меркаванне. Як нам уяўляецца, самае аўтарытэтнае, — генерала Жукава.

Георгій Канстанцінавіч у сваіх «Успамінах і разважаннях» выказаўся гранічна коратка: «У крытычныя дні ў Маскве панікёрам і правакатарам быў дадзены рашучы адпор». Калі ўжо Жукаў, чыя крутасць сапраўды не ведала межаў, знаходзіў, што нехта іншы здольны на тое ж самае, то можна сабе ўявіць, што́ гэта былі за рашучыя меры ў выкананні каменданта Сінілава...

Замежныя саюзніцкія місіі, якія наведвалі ў гады вайны Маскву, былі ўражаны парадкам у горадзе, дакладнасцю і ўзгодненасцю дзеянняў ваенных і грамадзянскіх ведамстваў. Высокія госці нязменна падкрэслівалі, што ў гэтых адносінах іншым сталіцам не грэх павучыцца.

Генерал Сінілаў непасрэдна кіраваў арганізацыяй каменданцкай службы сталіцы ў самыя цяжкія дні. Былі ўзятыя пад кантроль вакзалы і станцыі метро. Вуліцы і плошчы вялізнага горада ўзмоцнена патруляваліся круглыя суткі. Пры ўездзе ў горад, а таксама ў прыгарадах былі выстаўленыя заставы і кантрольна-прапускныя пункты, дзе правяраліся дакументы ва ўсіх асоб, якія ўязджалі або выязджалі з горада. Вось дзе спатрэбіўся Сінілаву яго вопыт арганізацыі і нясення памежнай службы!

Асабліва ярка арганізатарскія здольнасці К.Р. Сінілава праявіліся пры падрыхтоўцы гістарычнага ваеннага параду на Краснай плошчы 7 лістапада 1941 года. Аб маючым адбыцца парадзе Кузьма Раманавіч сам даведаўся за суткі, а пра дакладны час яго правядзення — і таго менш. У распараджэнні каменданта сталіцы было ўсяго толькі некалькі начных гадзін. Але і за гэты кароткі час, ва ўмовах вельмі складаных — вораг стаяў пад самымі сценамі Масквы — Сінілаў здолеў забяспечыць высокую і дакладную арганізацыю ўрачыстага мерапрыемства, удзельнікі якога прама з Краснай плошчы пайшлі на фронт.

Парад 7 лістапада сорак першага стаў прадвеснікам перамогі, ён усяліў упэўненасць у сэрцы і душы савецкіх людзей, што вораг будзе разбіты... Шмат яшчэ было парадаў на Краснай плошчы, але гэты парад, як і парад Перамогі 24 чэрвеня 1945 года, назаўжды ўрэзаўся ў памяць Сінілава...

Знакаміты асобны зводны батальён з 200 чалавек, які кідаў да падножжа Маўзалея рэгаліі пераможанага ворага — сцягі і штандары вермахта, напалову складаўся з ваеннаслужачых дывізіі Дзяржынскага. Камандаваў трыумфальным падраздзяленнем афіцэр старэйшага злучэння ўнутраных войск старшы лейтэнант Дзмітрый Воўк.

Чаму ўдзельнікаў баявых дзеянняў напалову разбавілі дзяржынцамі? Прычыны дзве. Першая: франтавікам, якія адвыклі ад стравога кроку, цяжка даваліся мудрасці «плацпараднай» навукі. Другая: цалкам верагодна, воіны-чэкісты ў радах спецыяльнага падраздзялення з'яўляліся дадатковым фактарам бяспекі каля Маўзалея.

«Мяне выклікалі ў штаб, — успамінаў праз гады падпалкоўнік у адстаўцы Дзмітрый Рыгоравіч Воўк, — дзе абвясцілі аб маючым адбыцца парадзе і загадалі рыхтаваць асобны батальён».

Ваенны камендант Масквы Кузьма Раманавіч Сінілаў выйшаў з агаломшаным старшым лейтэнантам у двор і асабіста паказаў, як трэба будзе кідаць сцягі, беручы ў рукі і з сілай кідаючы двухметровыя драўляныя распоркі ад палатак.

24 чэрвеня 1945 года зводны батальён быў пастроены каля сцен сабора Васіля Блажэннага за дзве гадзіны да пачатку парада. У першай шарэнзе — самыя рослыя дзяржынцы. Правафланговым — багатырскага целаскладу старшы сяржант Фёдар Легкашкур. Яму дастаўся асабісты штандар Гітлера, які быў уручаны за «асаблівыя заслугі» 1-й танкавай дывізіі СС.

Пасля ўражлівага праходжання парадных калон франтоў, радоў і відаў войск тысячатрубны духавы аркестр змоўк, над плошчай на імгненне павісла цішыня. І тут наступіла хвалюючая кульмінацыя — пад гучны барабанны дробат да Маўзалея павёў свой спецыяльны батальён Дзмітрый Воўк. Фашысцкія палотнішчы, намоклыя ад дажджу, значна пацяжэлі, што некалькі зблытала салдацкія шэрагі пры кіданні варожых сцягоў «да ног Крамля». Гэта відаць на кадрах кінахронікі.

## АПАЛА

Двойчы ў гэтыя гады Сінілаў атрымаў вышэйшую дзяржаўную ўзнагароду — ордэн Леніна. Ні да, ні пасля ніводзін ваенны камендант краіны не ўдастойваўся такіх ушанаванняў...

Канец 40-х — пачатак 50-х гадоў, як сведчаць архіўныя адкрыцці, адзначыліся жорсткай барацьбой крамлёўскіх і калякрамлёўскіх структур за ўладу. Уцягнутымі аказаліся многія. І не па сваёй, часам, волі. Генерал Сінілаў быў уваходны на самы верх, яго добра ведалі ў Крамлі, але ні разу не даў ён падставы западозрыць сябе ў групавых ці іншых сувязях. Можа, таму і цаніў яго Сталін. Па сутнасці, толькі аднаго чалавека не крануў са свайго атачэння ўсёмагутны правадыр — генерала Сінілава.

Прабыў на клапотнай пасадзе камендант без малога 12 гадоў. Яго не раз клікалі на высокія пасады ў акругі, у Генштаб. Кузьма Раманавіч аджартоўваўся: «Быў бы рады, ды вось гаспадар не адпускае...».

Не хочам, каб у кагосьці склалася меркаванне пра Сінілава, як пра нейкага служаку. Наадварот. Гэта быў рознабаковы, таленавіты чалавек. Выдатны спартсмен, барэц, у пасляваенны час узначальваў Усесаюзную федэрацыю класічнай барацьбы, усяляк апекаваў шахматыстаў і нават быў арбітрам аднаго з найбуйнейшых айчынных турніраў. І яшчэ Сінілаў валодаў рэдкім тэнарам. Сам Іван Казлоўскі аднойчы прапанаваў Кузьме Раманавічу праспяваць партыю разам.

І раптам усё рухнула. У верасні 1953 года яго выклікалі ў аддзел кадраў Мінабароны і ўручылі прадпісанне — у распараджэнне камандуючага Сібірскай ваеннай акругі. Чаму, на якой падставе, ды яшчэ так спешна?

Не без цяжкасцяў у Краснаярску знаходзяць генералу прыдатную пасаду: старшага выкладчыка ваеннай кафедры мясцовага лесатэхнічнага інстытута. Праз тры месяцы пайшоў на павышэнне — стаў начальнікам ваеннай кафедры Разанскага сельскагаспадарчага інстытута. Сябры спрабуюць дапамагчы, але лепшае, што ўдалося, — вярнуць у Маскву і прызначыць загадчыкам ваеннай кафедры Маскоўскага эканоміка-статыстычнага інстытута. Але і то пры ўмове, што ні пры якіх абставінах не будзе расказваць аб сваім мінулым. Нават у лістку па ўліку кадраў 35-гадовая ваенная біяграфія Сінілава змясцілася ў сціплым, расплывістым радку — «Служба ў Чырвонай Арміі». Дзе, на якіх пасадах, як узнімаўся па прыступках да зусім не радавога звання генерал-лейтэнанта, за што быў удастоены «іканастаса» ў выглядзе дзевяці высокіх дзяржаўных і замежных узнагарод? Пра гэта — ні слова...

Толькі ў гэтыя апошнія гады, калі ўпершыню ў жыцці ў Кузьмы Раманавіча з'явілася крыху вольнага часу, нават старыя калегі генерала даведаліся аб яго пазаслужбовых інтарэсах і прыхільнасцях. Аказалася, да прыкладу, што ён гарачы кнігалюб, у яго была старанна падабрана бібліятэка гістарычнай і ваеннай літаратуры.

Высветлілася таксама, што Кузьма Раманавіч выдатны шахматыст. Нярэдка згуляць партыю-другую да яго на маскоўскую кватэру або на дачу заязджаў чэмпіён свету гросмайстар Васіль Смыслоў. Нечаканасцю для тых, хто не ведаў пра сялянскае паходжанне Сінілава, з'явілася і яго прыхільнасць да развядзення пчол.

Клапатлівы бацька салдатам, ён быў добрым бацькам і ўласных дзяцей — дзвюх дачок і двух сыноў.

У канцы 57-га Кузьмы Раманавіча не стала. Пахаваны ён на Новадзявочых могілках.

**Анатоль СЛАНЕЎСКІ.**

# Краіна здароўя

Выпуск №20 (373)

■ Доктар адкажа

## Адкуль гэтае скрыгатанне?

*«Падкажыце, калі ласка, што азначае скрыгатанне зубамі па начах? Ці можна гэтага пазбавіцца?*

**Крысціна,** *г. Мінск».*

Тлумачыць **урач-стаматолаг-артапед 9-й стаматалагічнай паліклінікі г. Мінска Святлана ТУР:**

— Скрыгатанне зубамі па начах або пастаяннае сцісканне зубоў днём называецца бруксізмам. І ён небяскрыўдны: шкодзіць і зубам, якія сціраюцца, і ніжнесківічным суставам, і мышцам, і псіхіцы. Узнікае ў выніку скарачэння або спазму мышцаў. Можа назірацца пры паталогіі прыкусу і сківічна-скроневых суставаў, дрэнна падабраных пратэзах, алергіі, у дзяцей — як вынік родавай унутрычарапной траўмы або інтаксікацыі гельмінтамі.

Даследаванні замежных вучоных паказваюць, што на рызыку развіцця бруксізму не ўплываюць ні пол, ні ўзрост. А вось нязменным спадарожнікам з'яўляецца моцны стрэс на працягу дня.

Пры дзённым бруксізме пацыенту раяць самакантроль падчас эмацыянальнага напружання. Лячэнне гэтага стану застаецца сур'ёзнай праблемай, бо залежыць ад часу развіцця, прычын, характару захворвання. Бруксізм у немаўлят, як правіла, наогул праходзіць гадоў у 6-7. Дарослым жа з такой праблемай трэба рэкамендаваць кансультацыю стаматолага, які павінен разабрацца з усімі стаматалагічнымі праблемамі або дэфектамі прыкусу, а па-другое, вырабіць спецыяльную начную капу ад бруксізму. Такая капа будзе абараняць зубы ад сцірання, папярэджваць пераломы артапедычных канструкцый, прафілактаваць змяшчэнне зубоў, змяншаць нагрузку на мышцы і суставы. Выпрацоўваецца канструкцыя строга індывідуальна па адбітку зубоў. У момант прыступу яна будзе прымаць ціск на сябе і абараняць эмаль.

Аднак неабходна яшчэ і папрацаваць над сабой. Вучыцеся мінімізаваць і пазбягаць стрэсаў. Расслабляйцеся перад сном, асвойвайце аўтатрэнінг. Паспрабуйце як-небудзь пракантраляваць прыступы: расслабце жавальныя мышцы, як толькі адчуеце, што яны пачынаюць напружвацца. Калі ёсць парушэнні прыкусу або пашкоджанне зубной эмалі, звярніцеся да артапеда або артадонта

■ З адкрытым сэрцам

## ЖЫЦЬ З АЎТЫЗМАМ



Кіраўнік свайго ўласнага Сямейнага цэнтра Кацярына Каўрова прапанавала ў Фэйсбуку ўсім ахвотным ахвяраваць Цэнтру дапамогі аўтычным дзецям невялікую суму і атрымаць у падарунак гэту каляндную елачку.

«Вось такія калядныя елачкі з дубу будуць сёлета атрымліваць мае сябры ў падарунак! З кожнай елачкай цёця Каця перадасць навагоднія заданні для ўсёй сям'і, каб чаканне новага 2017 года было па-сапраўднаму чароўным!

Па традыцыі першую работу аддаю на добрыя справы — у падтрымку Цэнтра дапамогі аўтычным дзецям! Перавядзіце добраахвотнае ахвяраванне на рахунак цэнтра і дубовая елачка з заданнямі ад Каўровай будзе вашай!

Стартуем з 60 рублёў! Вышыня елачкі 80 см. Ручная работа, выбелены дуб!»

Кантакты цэнтра «AUTIS» — на сайце autis.by.

Лічыцца, што ў Беларусі каля 25 тысяч дзяцей з аўтызмам. Дарэчы, у Мінску не так даўно пачаў працаваць **Інклюзіўны цэнтр падтрымкі і суправаджэння сем'яў, якія выхоўваюць дзяцей з аўтызмам.** Спецыялісты арганізацыі займаюцца з бацькамі не толькі са сталіцы, але і іншых рэгіёнаў. Знайсці старонку цэнтра можна ў Фэйсбуку. Заняткі з бацькамі і дзецьмі бясплатныя, такой працягласці, якой запатрабуе канкрэтная сітуацыя. Аўтызм — складаны стан, і справіцца з ім аднаму чалавеку не па сілах, неабходна каманда спецыялістаў. Калі правільна пабудаваць эмацыянальныя паводзіны паміж членамі сям'і, дзіцяці з аўтызмам будзе нашмат прасцей у ёй жыць.

■ У залежнасці

## ПАМЫЛКА СВАЯКОЎ АЛКАГОЛІКА

**Сузалежнымі называюць у першую чаргу сваякоў і блізкіх алкаголікаў, наркаманаў ды іншых людзей з нейкімі залежнасцямі. Гэта нібы сазлучаныя сасуды. Чым цяжэй залежнасць, тым цяжэй і сузалежнаму. У сваю чаргу, паводзіны сузалежнага патураюць залежнасці...**

— На з'яўленне сузалежнасці могуць уплываць працяглае пражыванне з чалавекам, які пакутуе ад залежнасці, дзіцячыя траўмы або штосьці яшчэ, але вінаваціць сябе ні ў якім разе нельга, лепей разбірацца з тым, як пазбавіцца гэтага стану, — тлумачыць **урач-псіхатэрапеўт Мінскага гарадскога клінічнага псіхіятрычнага дыспансера Алена ШПІЛЕЎСКАЯ.** — На жаль, сузалежныя не разумеюць сваёй ролі ў хваробе блізкага. «Я ж не п'ю! Хай той, хто п'е, той і лечыцца!», — так яны заяўляюць. Але алкагалізм — гэта хвароба сям'і!

Вы сузалежныя, калі...

...татальна кантралюеце паводзіны залежнага сваяка;

...забыліся пра свае патрэбы, інтарэсы і задавальненні;

...несвабодныя ў сваіх пачуццях, думках, паводзінах;

...адчуваеце пастаянны неспакой («куды пайшоў?», «з кім пайшоў?», «колькі грошай у яго ў кішэні?», «ці дойдзе дадому?», «ці не ўкраў/не прадаў/не спаліў?»);

...урач ужо выявіў у вас дэпрэсіўныя, трывожныя, псіхасаматычныя захворванні;

...апякаеце залежнага: корміце за свой кошт, прыбіраеце, абараняеце ад міліцыі, хаваеце, пакуль магчыма, залежнасць ад суседзяў;

...празмерна перагружаныя — эмацыянальна і фізічна;

...ужо неаднаразова прасілі, плакалі, патрабавалі, скандалілі, пагражалі, малілі, ратавалі.

### Як пазбавіцца сузалежнасці?

1. Шукайце аднадумцаў, якія таксама хочуць змяніцца.
2. Прызнайце: існуюць абставіны, паўплываць на якія вы не можаце.
3. Паглядзіце на сябе. Вучыцеся быць сабой.
4. Не дапамагайце! Ні грашамі, ні адзеннем, ні прадуктамі.
5. Давайце параду, толькі калі вас папрасілі.
6. Трымайцеся аднолькавых паводзінаў усёй сям'ёй.
7. Не чакайце, што залежны адумаецца.
8. Звярніцеся да ўрача-псіхатэрапеўта і прывядзіце ў гармонію свой душэўны стан

■ Таму што восень

## І ЛІБІДА ПРАПАЛА?

**Восенню, калі дні імкліва скарачаюцца, некага можа напаткаць сезоннае афектыўнае расстройства. Звычайна ў групе рызыкі — маладыя жанчыны, якія зімой адчуваюць песімізм, кволасць, апатыю, стомленасць незалежна ад абставін, у іх узнікае жаданне ўжываць больш вугляводаў і менш займацца сексам, а вясной усё гэта знікае.**



Аналагічныя сімптомы могуць быць праявай іншых псіхічных і саматычных захворванняў, а таму трэба паказацца кваліфікаванаму спецыялісту, нагадвае **ўрач-псіхатэрапеўт Мінскага гарадскога клінічнага псіхіятрычнага дыспансера Марына ШЧАСЛЁНАК.** Лячэнне стану прадугледжвае выкарыстанне антыдэпрэсантаў і псіхатэрапеўтычных метадаў.

А для прафілактыкі захворвання рэкамендуецца праводзіць максімум часу на вуліцы, нават у пахмурнае надвор'е. Харчавацца трэба так, каб стравы змяшчалі як мага больш карысных рэчываў. Рэгулярна выконвайце фізічныя практыкаванні і наогул вядзіце актыўны лад жыцця. Важнае значэнне будзе мець падтрымка блізкіх, дабрабыт як у асабістым, так і ў прафесійным жыцці

■ Лепш папярэдзіць

# Не давесці печань да цырозу...

**За апошнія гадоў дваццаць колькасць хворых на гепатыт і цыроз вырасла ў тры разы. Пацыентаў з хранічнымі захворваннямі печані можна знайсці ў кожнай палаце гастраэнтэралагічнага профілю, а яшчэ ў пачатку 1990-х не маглі і аднаго адшукаць, каб прадэманстраваць студэнтам-медыкам для прыкладу.**



Фота Надзеі БУЖАН.

Печань — орган унікальны. Ні сэрца, ні ныркі, ні любы іншы орган не выконвае такі аб'ём работы. Галоўнае, як вядома, самыя розныя віды абмену — тлушчавы, мінеральны... Калі клеткі печані гінуць, тыя, што засталіся, могуць узяць на сябе іх функцыі, чаму ў народзе і кажуць, нібыта печань самааднаўляецца. Аднак гэта не зусім так, як нам хацелася б. Працэс такой узаемавыручкі не бясконцы. Калі гэта, напрыклад, хранічны гепатыт, то кампенсацыя сапраўды яшчэ магчымая, аднак калі гэта цыроз — передракавы стан — то клеткі печані, гепатацыты, гінуць незваротна.

— Што такое хранічны гепатыт? Гэта запаленне, якое працягваецца звыш шасці месяцаў. Чалавек можа нічога ў гэты час не адчуваць, але частка пячоначных клетак будзе проста гінуць, — тлумачыць **дацэнт 2-й кафедры ўнутраных захворванняў Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта, кандыдат медыцынскіх навук, урач-гастраэнтэролаг вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі Мікалай КАПРАЛАЎ.** — Адкуль жа бярэцца гепатыт? Самая распаўсюджаная прычына гэтага захворвання — вірýснае пашкоджанне. Вірусы гепатыту B, C і Д здольныя пранікаць у кроў. Далей вірус можа ўбудавацца ў клетку і заставацца там не размнажаючыся. Пры аслабленні імунітэту ці з нейкіх іншых прычын вірус можа пачаць размнажацца, і тады пацыент небяспечны — ён можа заразіць іншых пры кантакце з крывёй.

Самым небяспечным з'яўляецца вірус гепатыту С. Цыроз у такім выпадку развіваецца ў кожнага чацвёртага носьбіта віруса — многае будзе залежаць ад своечасовасці лячэння антывіруснымі прэпаратамі, якія блакіруюць размнажэнне віруса, а значыць, захворванне перастае прагрэсіраваць да цырозу. Лячэнне праводзіць урач-інфекцыяніст, і адбываецца яно працяглымі курсамі. Калі ж лячэння няма наогул, або яно праводзіцца паралельна з ўжываннем алкаголю або наркатычных рэчываў, пашкоджанне будзе працягвацца. У печані ўсё больш актыўна будзе развівацца фіброзная тканка, і клеткі будуць губляць сувязь з сасудамі, не змогуць атрымліваць ні кіслароду, ні пажыўных рэчываў, а значыць, незваротна загінуць. Трагедыя ў тым, што многія хворыя трапляюць у поле зроку ўрача толькі на гэтай стадыі, калі фактычна нічым ужо дапамагчы нельга. Няма сэнсу і ў аперацыі па трансплантацыі донарскага органа. Некаторым такое сур'ёзнае ўмяшанне можа быць проціпаказана нават на больш ранніх стадыях — таму што яны злоўжывалі і працягваюць злоўжываць алкаголем. А для перасадкі патрабуецца абсалютная адмова ад спіртных напояў. Схаваць факт ужывання не ўдасца ніяк: усю праўду раскажуць спецыяльныя тэсты, якія па аналізе крыві ўстанаўліваюць, ці ўжываў чалавек алкаголь на працягу апошніх шасці месяцаў. Усё ж такі размова ідзе пра сур'ёзныя фінансавыя затраты на лячэнне такога хворага, і немагчыма выкідваць іх на вецер для таго, каб часова ратаваць пацыента, які не жадае сам сабе дапамагаць.



— Да 75 працэнтаў выпадкаў захворвання на цыроз звязаныя са злоўжываннем алкаголем. Напоі з градусам — атрута для арганізма ў цэлым і для печані ў прыватнасці. Аднак гэта не азначае, што цыроз з'явіцца літаральна адразу, пасля першай чаркі, — спатрэбіцца ад некалькіх месяцаў да некалькіх гадоў, — тлумачыць Мікалай Капралаў. — Мы кажам пра злоўжыванне, але што ў такім разе ўжыванне нармальнае і ці ёсць яно ў прынцыпе? Замежныя вучоныя ўстанавілі так званую бяспечную колькасць этанолу. Гэта 40—60 г спірту ў дзень для мужчын і 20—40 г — для жанчын. Інакш кажучы, дапушчальная доза — 80—120 г 40-градуснага напою ў дзень. Два дні на тыдні пры гэтым павінны быць абсалютна цвярозымі! Больш таго, мы кажам пра людзей здаровых, а тым, у каго ёсць нейкія хранічныя захворванні, неабходна мець на ўвазе дозу яшчэ меншую, а ў некаторых выпадках не ўжываць алкаголь зусім. Трэба ўлічваць і нейкія генетычныя асаблівасці ператтраўлівання. Так, у жанчын орган будзе пашкоджвацца хутчэй, чым у мужчын, у прадстаўнікоў адной народнасці — больш, чым у другой...

Як жа правільна ўжываць алкаголь? Заходнія вучоныя даследавалі і гэта. І прыйшлі да высновы, што таксічнасць алкаголю істотна зніжаецца, калі ўжываць яго выключна пасля ежы, а не на галодны страўнік.

Харчаванне пры такіх захворваннях, як гепатыт і цыроз, павінна быць разнастайным, багатым на садавіну і гародніну. Асабліва карысная для клетак печані мякаць гарбуза. А вось тлустую і вострую ежу з рацыёну трэба выдаліць.

Дарэчы, абараняць печань трэба і ад вялікай колькасці ежы. Нездарма існуе такі дыягназ, як неалкагольнае тлушчавае пашкоджанне. Урачы нярэдка цяпер карыстаюцца тэрмінам «харчовы запой», калі назіраюць людзей з атлусценнем, абумоўленым залежнасцю ад пастаяннага жавання. Пераадолець гэты від залежнасці бывае часам цяжэй, чым алкагольную, але зрабіць гэта неабходна! Атлусценне спрыяе таму, што тлушч назапашваецца не толькі пад скурай, але і ва ўнутраных органах — адкладанні тлустых кіслот у печані называюцца стэатозам. Гэта захворванне само па сабе моцна перашкаджае нармальнай рабоце органа, а калі хворы з лішняй вагой яшчэ і злоўжывае алкаголем, то мае ўсе шанцы яшчэ хутчэй прыйсці спачатку да стэатагепатыту, а затым і да цырозу.

Відавочна, знізіць вагу — такой будзе першая рэкамендацыя ўрача пацыенту. Дабівацца новай формы трэба досыць павольна. Імклівая страта масы цела можа прывесці нават да лятальнага канца. Што да пахудзення, то ніякіх асаблівых сакрэтаў тут няма. Існуюць толькі два спосабы дасягнення поспеху на гэтым шляху. Першы — зніжэнне каларыйнасці ежы, асабліва за кошт змяншэння колькасці вугляводаў і паніжэння тлустасці страў, другі — павелічэнне фізічнай актыўнасці да 1-1,5 гадзіны штодня.

Наогул, печань распраўляецца са многімі шкоднымі рэчывамі, што трапляюць у арганізм. Не сакрэт, неядомыя грыбы і свінец з'яўляюцца смяротнымі для гэтага органа. Аднак значна часцей пачалі сустракацца лекавыя гепатыты — колькасць хворых з такім пашкоджаннем печані ў нашай краіне павялічваецца. Галоўным чынам таму, што мы надта любім самастойна палячыцца, у тым ліку антыбіётыкамі. Між тым у некаторых людзей назіраецца спадчынная непераноснасць тэтрацыклінаў, якія проста за лічаныя дні могуць забіць печань. Шкоднае ўздзеянне на орган аказваюць і супрацьтуберкулёзныя прэпараты, некаторыя кардыялагічныя прэпараты, той жа аміядарон, аднак гэта не азначае, што іх нельга ўвогуле прымяняць у лячэбнай практыцы. Важна заўсёды прымаць лекі пад наглядам спецыяліста

### УСЁ ПАЧЫНАЕЦЦА... СА СЛАБАСЦІ

**Звярніце ўвагу на свае адчуванні. У самым пачатку фарміравання хранічнага гепатыту зніжаецца працаздольнасць, з'яўляюцца кволасць, агульная слабасць, парушаецца сон. Пазней далучаецца боль і адчуванне цяжару ў правым падрабрынні, можа быць млосць, непрыемны пах з ротавай поласці, жаўцеюць склеры вачэй. У хворага на цыроз ацякаюць ногі, павялічваецца жывот, на целе з'яўляюцца сасудзістыя зорачкі.**

**Пры падазрэнні на праблемы з печанню ўрач павінен прызначыць біяхімічны аналіз крыві для даследавання некалькіх паказчыкаў — білірубіну, АСТ, АЛТ, гамаГТП, ЛДГ і іншыя.**

■ Асаблівасці захворвання

# ЦУКРОВЫ ДЫЯБЕТ: ХТО Ў ГРУПЕ РЫЗЫКІ?

## 15 працэнтаў беларусаў маюць рызыку развіцця цукровага дыябету ў найбліжэйшыя 5—8 гадоў

**Як не захварэць, а калі захварэў, то як жыць якасна і даўжэй, тлумачыць намеснік галоўнага ўрача па медыцынскай часці Рэспубліканскага цэнтра медыцынскай рэабілітацыі і бальнеалячэння Ірына ХМАРА.**

Кожны адзінаццаты ў свеце хварэе на цукровы дыябет. Паводле прагнозаў, да 2040 года будзе ўжо кожны дзясяты. У нашай краіне колькасць такіх хворых таксама расце. Сёння на дыспансерным уліку ўжо 287 тысяч пацыентаў з дыябетам 2 тыпу, больш за 17 тысяч — 1 тыпу.

Для выяўлення рызыкі наступлення захворвання прымяняецца спецыяльная анкета-апытальнік, а таксама аналіз крыві на глюкозу і спецыяльны аналіз на глікіраваны гемаглабін.

У групе рызыкі па развіцці дыябету 2 тыпу — мужчыны з аб'ёмам таліі больш за 94 см і жанчыны з таліяй больш за 80 см. Тыя, у каго індэкс масы цела перавышае 28 кг/м$^2$, а ўзрост — больш за 40 гадоў. Хто мала рухаецца і не праходзіць на працягу тыдня хоць бы неабходныя 150 хвілін. Хто няправільна харчуецца — з лішкам тлушчу і вугляводаў, дэфіцытам агародніны і фруктаў, вітамінаў. Курэнне і спажыванне алкаголю — дадатковы фактар рызыкі. Значэнне будуць мець павышаны артэрыяльны ціск, высокі ўзровень халестэрыну, а таксама наяўнасць цукровага дыябету ў сваякоў.

Для прафілактыкі будзе важным не набіраць вагу, мяняць свае харчовыя паводзіны — у першую чаргу скарачаць долю простых вугляводаў. Трэба сачыць за ўзроўнем халестэрыну, больш рухацца і не курыць. Асаблівую насцярожанасць трэба праяўляць і людзям з іншымі хранічнымі захворваннямі, напрыклад, з панкрэатытам, эндакрыннай паталогіяй.

Калі дыягназ пастаўлены, самае важнае — як мага хутчэй прыступіць да выканання рэкамендацый урача, каб не ўпусціць час пачатку лячэння. Гэта важна для захавання клетак падстраўнікавай залозы. Аднак перш-наперш неабходны здаровы лад жыцця. Давядзецца павялічыць фізічную актыўнасць, пазбавіцца шкодных звычак, пачаць правільна харчавацца.

Лячыць захворванне так, як прадпісаў урач, значыць, прадухіляць і адтэрміноўваць наступленне ўскладненняў. Пры дыябеце 2 тыпу без здаровага ладу жыцця і адэкватнага лячэння істотна павялічваецца рызыка інфаркту міякарда, інсульту, дыябетычнай нефрапатыі, гангрэны і ампутацыі ніжніх канечнасцяў.

На базе паліклінік і лячэбных аддзяленняў бальніц у краіне працуюць 229 школ дыябету, дзе пацыентаў вучаць падтрымліваць якасць жыцця і кантраляваць захворванне. 13 кабінетаў дыябетычнай ступні — гэта спецыялізаваная дапамога хворым са змяненнямі ў нагах. Распаўсюджаныя некалі траўматычныя ампутацыі сустракаюцца радзей, звычайна размова ідзе пра мінімальныя хірургічныя ўмяшанні. Дзякуючы назіранню і своечасоваму абследаванню, комплекснаму лячэнню зніжаецца і колькасць паталогій вачэй.

На базе Рэспубліканскага цэнтра медыцынскай рэабілітацыі і бальнеалячэння працуе **Рэспубліканскі цэнтр эндакрыннай паталогіі**. Тут і дзеці, і дарослыя могуць абследавацца ва ўрача-энакрынолага, вузкіх спецыялістаў, магчыма правядзенне неабходных лабараторных і іншых відаў даследаванняў, а таксама выконваецца лазерная каагуляцыя сятчаткі для лячэння дыябетычнай рэцінапатыі

Цукровы дыябет 1 тыпу развіваецца як у дзяцей, так і ў падлеткаў. Першы пік прыпадае на 5-6 гадоў, другі — на час палавога выспявання.

— Да 2020 года прагназуецца падваенне колькасці дашкольнікаў з дыябетам 1 тыпу, — кажа **галоўны пазаштатны дзіцячы эндакрынолаг Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь Анжэліка СОНЦАВА.** — На развіццё захворвання будзе ўплываць не толькі генетыка — устаноўлена каля 40 генетычных локусаў, якія спрыяюць развіццю цукровага дыябету. Паўплываць могуць і шматлікія знешнія моманты. Напрыклад, увядзенне ранняга, да 4 месяцаў, прыкорму, ужыванне каш на аснове глютэну, сумесяў на каровіным малацэ, дысбаланс вітамінаў, асабліва дэфіцыт вітаміну Д, а таксама перанесеныя энтэравірусныя інфекцыі, пастаяннае ўздзеянне вялікай колькасці хімічных злучэнняў.

Захворванне ў дзяцей таксама здольнае прыводзіць да ўскладненняў, звязаных з пашкоджаннем сасудаў. Церпяць вочы, печань, сардэчна-сасудзістая сістэма. Колькасць ускладненняў за апошнія гады знізілася дзякуючы даступнасці, у тым ліку на абласным узроўні, амбулаторных і стацыянарных школ навучання бацькоў.

З лета гэтага года дзеці забяспечваюцца на бясплатнай аснове трыма тэст-палоскамі ў дзень для кантролю ўзроўню глюкозы. Большасці дзяцей, якія знаходзяцца на шматразовых ін'екцыях інсуліну, рэкамендуецца адсочваць узровень цукру ў крыві 4-5 разоў у дзень. Дарослым з 1-й і 2-й групамі інваліднасці выдаюцца на бясплатнай аснове дзве тэст-палоскі.

**Матэрыялы падрыхтавала Святлана БАРЫСЕНКА.** *protas@zviazda.by*

Наш Максім Багдановіч



# СПЛЯТАЮЧЫ ВЯНОК

Галоўнае шчасце пісьменніка — трымаць у руках уласную кнігу. Нават разумеючы, што ў ёй нешта зроблена не так, як хацелася б, не дацягвае яна месцамі да запланаванага мастацкага ўзроўню. Ды ўсё ж кніга — жывы голас аўтара да сучаснікаў, яго «выклік» і крытыкам, і шырокаму грамадству. Пачуйце, узважце, выкажыце меркаванне, пахваліце, пакрытыкуйце! А можа не проста гучным выклікам яна стане, а падзеяй у жыцці роднай літаратуры, замежжа. Хто ведае?

Поўны салодкага чакання, выношваў ідэю ўласнай кнігі і Максім Багдановіч. Добра ўсведамляў, што першая кніга можа стаць апошняй... Можа таму так старанна і прадумваў логіку размяшчэння вершаў, кампазіцыю, змястоўнае напаўненне. Планаваў зборнік у трох частках (пазней Алег Лойка знойдзе ў гэтым гармонію дантаўскага прынцыпу траічнасці): «Малюнкі і спевы», «Мадонны», «Каханне і смерць». На жаль, пры падрыхтоўцы выдання была адкінута апошняя частка. У нечым згубіўся, такім чынам, філасофскі зварот Багдановіча да чытача. Бо малады, невылечна хворы Максім жадаў, відавочна, закончыць сваю кнігу ўсё ж на ноце трагічнай, што была такой блізкай яго жыццёваму шляху. Але ж не будзем марна наракаць на выдаўцоў. Яны падарылі паэту шырокае гучанне яго песні, таму і паміраў ён «не самотны».

Калі б не намаганні «нашаніўцаў», адзіная прыжыццёвая кніга сапраўды геніяльнага паэта магла б так і не пабачыць свет. Сям'я Багдановіча на той час мела вялікія матэрыяльныя цяжкасці, пра якія сведчыць ліст Максіма ў рэдакцыю ў пачатку 1913 года: «Што да выдання кніжкі, дык бачу, што яно спыняецца галоўным чынам праз недахват грошы, але ніяк не прыдумаю, як Вам памагчы. Сам я не зарабляю, у бацькі прасіць, дык ён многа даць не можа, бы жыве ад 20-га да 20-га, да таго ж і вінен шмат каму. Але вось што: калі я ачуняю, дык я паспрабую заняць пад кніжку ў розных сваіх знаёмых грошы». Ды цяжкасці не спынялі энтузіястаў. І вось у 1914 годзе (на тытуле стаіць 1913 год, але тады выдаць не паспелі) зборнік «Вянок» дайшоў-такі да чытача. У віленскай друкарні Марціна Кухты яго выпусцілі накладам 2000 асобнікаў. У выданні прыняло ўдзел Беларускае выдавецкае таварыства. Між іншым, адзінае на той час, якое выплачвала аўтарскія ганарары. Фінансавую падтрымку аказала і Марыя Магдалена Радзівіл (народжаная Завіша). У знак вялікай удзячнасці на тытульным аркушы кнігі змешчаны герб роду Завішаў — «Лебедзь»...

«Вянок», які змяшчаў 92 вершы і дзве паэмы, з'явіўся выключна арыгінальнай творчай падзеяй. Пры некаторай змястоўнай блізкасці, ён усё ж даволі значна адрозніваецца ад зборнікаў Цёткі, Янкі Купалы, Якуба Коласа... І тэхнікай вершавання, і вобразнасцю. Багдановіч выкарыстоўвае больш за 20 вершаваных памераў, актыўна звяртаецца да класічных формаў верша, выкарыстоўвае нечаканыя рытмічныя магчымасці. І гэта пры тым, што і лірычныя малюнкі прыроды ў яго чароўна адухоўленыя, і інтымныя пачуцці выяўляюцца абаяльна шчымліва, і пра грамадзянскія пытанні паэт не баіцца гучна прамовіць. Знаходзіць тое гарманічнае суладдзе, аб якім мараць многія сталыя творцы, — вось што часцяком удавалася рабіць маладому Багдановічу.

А. Луцкевіч красамоўна выказаўся пра зборнік наступным чынам: «Багдановіч умее ўсё ажывіць,ператварыўшы па-свойму. І лёгка льюцца яго вершы кунштоўнай філіграннай работы, а кожын формаю падходзіць да думкі. Думак тых — багата, і вось бачым у вянку вершы такой формы, такой будовы, — часта вельмі рэдкай, — якой могуць пахваліцца толькі найбольш культурныя народы з найвышэй развітай літаратурнай мовай». А цікавая інтэрпрэтацыя старажытных міфалагічных вобразаў, яскравая каларытнасць у «Вянку» — шчырае і несумненнае імкненне Багдановіча наблізіць да сябе любую «краіну-браначку», па-сапраўднаму адчуць сябе яе сынам, хоць і на адлегласці. Бацька паэта пасля смерці сына справядліва казаў: «Яму хацелася паказаць, што няма такіх памераў, няма такіх формаў, якія былі б чужыя беларускай мове. Якія цяжкасці ён пераадолеў на гэтым шляху, сведчаць яго рукапісы і сшыткі... Які з паэтаў, што ўвассаў беларускую мову з матчыным малаком, узнімаў гэту цяжкую карпатлівую працу? А ён, слабагруды, кволы, узняў».

«Вянок» назваў сваю кнігу Максім Багдановіч, бо прысвяціў яе сябру па пяры, які таксама рана пайшоў з жыцця, — Сяргею Палуяну. Гэта вянок на яго слаўную магілу. «Красу і светласць, і прастор шукаў», — пісаў пра Палуяна Багдановіч. І гэтыя словы магічным чынам характарызуюць і самога Максіма-Кніжніка...

Пасля былі і іншыя «Вянкі». Дапоўненыя, факсімільныя, перакладныя. Ужо ў 1927 годзе з'явіўся аднайменны зборнік, прымеркаваны да 10-й гадавіны смерці паэта з некаторымі рэдактарскімі праўкамі ў творах. Выдавецтвам «Мастацкая літаратура» прадстаўлена факсімільнае выданне класічнага зборніка. Перыядычна з'яўляліся і пераклады кнігі на іншыя мовы свету. Перакладчык «Вянка» на ўкраінскую мову М. Драй-Хмара тлумачыў сваё жаданне пераўвасабляць творы Багдановіча на роднай мове: «Па-першае, ён з'яўляецца адным з тых пісьменнікаў-класікаў, што стварылі аснову беларускай мастацкай літаратуры; па-другое, ён з'яўляецца выдатным майстрам слова, які чула адгукаўся на ўсе праявы нацыянальнага і сацыяльнага вызвалення беларускага народа; па-трэцяе, ён з надзвычайнай любоўю ставіўся да ўкраінскай культуры ўвогуле і да літаратуры асабліва».

Так наш шчыры, інтэлігентны Максім Багдановіч са сваёй кнігай у руках крочыць і сёння па вялікім свеце... Слухае чужое, ды пяе сваё.

**Юлія АЛЕЙЧАНКА.**

**Максім Багдановіч**

* * *

Цветы последние милей
Роскошных первенцев полей.
**А. Пушкін**

*Плакала лета, зямлю пакідаючы;*
*Ціха ліліся слязінкі на поле.*
*Але прыгожаю восенню яснаю*
*Там, дзе упалі яны, выраслі*
*Кветкі асеннія, кветкі, ўспаённыя*
*Тугаю, горам, слязінкамі лета.*
*Кветкі асеннія, родныя, бедныя!*
*Выраслі вы, каб ураз жа і згінуць.*
*Можа, таму-то душа надарваная*
*Гэтак любоўна вянок з вас сплятае.*

■ А не шкодзь!

## Безбілетнікаў — да адказу

Як неарганізаваная высечка стала незаконнай

**На аўтадарозе Кострычы — Кіраўск супрацоўнікі Бабруйскай міжрайінспекцыі спынілі для праверкі лесавоз з прычэпам, які належаў прыватнаму прадпрыемству з Кіраўска. Колькасць драўніны адрознівалася ад заяўленай у суправаджальных дакументах, нумар пуцявога ліста не адпавядаў паказанаму ў накладной. Выказаўшы здагадку, што могуць быць і іншыя парушэнні, дзяржінспектары вырашылі праверыць лесасеку, з якой вывозілася драўніна.**

Распрацоўка апошняй ішла поўным ходам. Вальшчыкі і трактарысты растлумачылі, што прыватнае прадпрыемства, работнікамі якога яны з'яўляюцца, падрадзілася высечы ўчастак лесу на тэрыторыі Бабруйскага лясгаса. Кантраляваць рубку павінен быў мясцовы лесапункт, расказалі ў Дзяржінспекцыі. Работы пачаліся яшчэ год таму і па першапачатковым плане павінны былі скончыцца да 31 снежня 2015 года. Аднак, як высветлілася пазней, у снежні лесасечны білет падоўжылі да канца чэрвеня 2016 года, а пасля яшчэ на тры месяцы — да 30 верасня. Тым не менш на працягу гэтых трох месяцаў рубкі на лесасеках ніхто не праводзіў. Звяртацца з просьбай аб чарговым падаўжэнні начальнік лесапункта, мабыць, не адважыўся. Бо за кожны месяц падаўжэння лясгас пералічвае ў бюджэт па 1,5 працэнта ад кошту невысечанай драўніны. У кастрычніку лесарубы зноў з'явіліся на лесасеках і пачалі наганяць упушчанае. Вось толькі зараз рубка з неарганізаванай ператварылася ў незаконную. Адсутнасць дзеючага лесасечнага білета не перашкодзіла супрацоўнікам лесапункта забяспечыць падрадчыка накладнымі на вываз прадукцыі. Як быў улічаны гэты лес — застаецца толькі гадаць. На тэрыторыі лесасекі дзяржінспектары налічылі 120 свежых пнёў. Па іх разліках незаконна нарыхтавана 186 кубоў драўніны.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*


СООБЩЕНИЕ УНП 800006543

*В соответствии с подпунктами 16.1 и 18.2 Инструкции о порядке раскрытия информации на рынке ценных бумаг сообщаем информацию о сделке, совершенной с акциями собственной эмиссии, которая является сделкой с заинтересованностью аффилированного лица эмитента:*

- полное наименование эмитента:

**Закрытое акционерное общество «КорпКонсалт»;**

- местонахождение эмитента: 220037, город Минск, переулок Козлова, дом 7б, комната 305;
- дата принятия решения о совершении сделки: 10 ноября 2016 года;
- стороны сделки: эмитент (покупатель) и Компания «РИЭЛТИ КОРПКОНСАЛТ (АР-СИ-ЭЛ) ЛТД» (продавец);
- предмет сделки: купля-продажа 79 366 простых (обыкновенных) акций эмитента;
- критерии заинтересованности: лица, указанные в абзацах втором-четвертом части седьмой статьи 57 Закона Республики Беларусь «О хозяйственных обществах» не являются заинтересованными в совершении данной сделки;
- сумма сделки: 500 005 евро 80 евроцентов;
- балансовая стоимость активов эмитента на 30 сентября 2016 года: 7 402 072 белорусских рубля;
- цель приобретения простых (обыкновенных) акций: аннулирование в связи с принятием решения об уменьшении уставного фонда акционерного общества путем приобретения части акций в целях сокращения их общего количества;
- вид сделки и способ приобретения простых (обыкновенных) акций: акции приобретены посредством заключения договора купли-продажи;
- дата зачисления простых (обыкновенных) акций на счет «депо» эмитента: 11 ноября 2016 года;
- количество приобретенных простых (обыкновенных) акций: 79 366 штук;
- доля (в процентах) приобретенных простых (обыкновенных) акций в общем количестве эмитированных эмитентом простых (обыкновенных) акций: 97,422%.


■ Цікава

## Як сонца дапамагае мыць машыны

**Першая энергаэфектыўная аўтамыйка на сонечных батарэях пачала працу ў Гродна. Як расказаў журналістам аўтар ідэі, дырэктар гродзенскага прыватнага прадпрыемства Дзмітрый СІЦЬКО, гэта аўтамабільная мыйка самаабслугоўвання, у якой выкарыстоўваецца электраэнергія не з агульнай сеткі, а ад сонечных батарэй.**

Яна адкрылася на паркоўцы ў спальным раёне Вішнявец. Яшчэ на стадыі праектавання паркоўкі частку тэрыторыі вырашана было адвесці пад сонечныя батарэі. Першапачаткова энергіяй сонца сілкаваліся асвятленне на стаянцы, тэхніка і сістэма ацяплення ў доміку адміністратара. Пазней было прынята рашэнне выкарыстаць альтэрнатыўную энергію для працы аўтамыйкі на чатыры пасты.

«Першыя ўражанні пасля запуску — станоўчыя. Зараз устаноўлены батарэі сумарнай магутнасцю каля 27 кВт у гадзіну. У сонечнае надвор'е энергіі, што выпрацоўваецца комплексам, цалкам хапае для забеспячэння работы мыйкі. Энергія выпрацоўваецца і ў пахмурныя дні, нават у самае неспрыяльнае надвор'е «ад сонца» забяспечваецца дзейнасць паловы пастоў аўтамыйкі», — адзначыў Дзмітрый Сіцько.

У бліжэйшы час магутнасць «сонечнага парка» павялічаць удвая: батарэі для гэтага ўжо ўстаноўлены, засталося іх толькі падключыць. «Выкарыстоўваем у рабоце і энергаэфектыўныя тэхналогіі, напрыклад святлодыёднае асвятленне на стаянцы і на самой мыйцы. Калі гэты праект пакажа сябе з добрага боку, то будзе і далей развівацца ў напрамку энергаэфектыўнасці і альтэрнатыўнай энергетыкі», — адзначыў Дзмітрый Сіцько. Ён дадаў, што карысць ад выкарыстання сонечнай энергіі кліенты змогуць адчуць на ўласнай кішэні.

**Раман АЛЯХНОВІЧ**

Даты | Падзеі | Людзі

**16 ЛІСТАПАДА**

**1766** год — нарадзіўся Радольф Крэйцэр, французскі скрыпач, кампазітар, дырыжор. Камер-віртуоз двара Напалеона І, Людовіка XVIII. Людвіг ван Бетховен прысвяціў Крэйцэру санату для скрыпкі і фартэпіяна (так званую Крэйцэраву санату).

**1905** год — нарадзіўся (вёска Труханавічы, цяпер у Капыльскім раёне) Ян (Іван Аляксеевіч) Скрыган, беларускі пісьменнік, заслужаны работнік культуры Беларусі. Працаваў у Дзяржаўным выдавецтве Беларусі, у часопісе «Полымя», загадчыкам рэдакцыі Беларускай Савецкай Энцыклапедыі. У 1975—1985 гадах — адказны сакратар Камітэта па Дзяржаўных прэміях Беларусі ў галіне літаратуры, мастацтва і архітэктуры. Аўтар кніг «Буры над затокаю», «Скажы адно слова», «Мая аповесць» і інш. Пераклаў на беларускую мову кнігі і асобныя творы І. Буніна, М. Горкага, К. Федзіна, украінскіх, літоўскіх, латышскіх і эстонскіх аўтараў. У 1936 годзе рэпрэсаваны і высланы ў Кемераўскую вобласць. У 1946 годзе быў вызвалены. У 1949-м зноў арыштаваны і высланы ў Сібір. Рэабілітаваны ў 1954 годзе. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі за ўдзел у стварэнні Беларускай Савецкай Энцыклапедыі. Памёр у 1992 годзе.



**1911** год — 105 гадоў таму нарадзіўся (мястэчка Мір, цяпер у Карэліцкім раёне) Марк Канстанцінавіч Гавурын, савецкі матэматык, доктар фізіка-матэматычных навук, прафесар. У 1936 годзе скончыў Ленінградскі ўніверсітэт, працаваў у ім. Заснавальнік навуковай школы ў галіне тэорыі аптымізацыі, вылічальнай матэматыкі і прыкладнога праграмавання. Аўтар навуковых работ па функцыянальным аналізе, матэматычнай эканоміцы, вылічальнай матэматыцы, матэматычным праграмаванні. Памёр у 1992 годзе.

**1926** год — нарадзіўся Аляксей Сцяпанавіч Суэцін, беларускі спартсмен (шахматы), шахматны тэарэтык і метадыст. Майстар спорту СССР, міжнародны гросмайстар, заслужаны трэнер. Памёр у 2001 годзе.

**1941** год — байцы 316-й стралковай дывізіі пад камандаваннем І. Панфілава, утрымліваючы рубеж абароны на Валакаламскім напрамку каля раз'езда Дубасекава, затрымалі атаку на Маскву 50 нямецкіх танкаў. Большасць байцоў загінулі, астатнія былі цяжка параненыя. Бой пад Дубасекавам увайшоў у гісторыю як подзвіг 28 панфілаўцаў, усім яго ўдзельнікам прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

Было сказана

**Георгій МАРЧУК, пісьменнік, публіцыст:**
*«Настойлівасць — твар упартасці, настырнасць — яе рукі».*

Крынічка

Вядучая рубрыкі Ірына ТАМКОВІЧ. Тэл. 8 (017) 287-18-15

*Аказваецца, яны могуць гэта зрабіць рознымі спосабамі — напрыклад, ачышчаючы паветра ў пакоі або дапамагаючы заснуць*

## Як пакаёвыя расліны могуць палепшыць наша жыццё

**Амаль у кожнага з нас дома ёсць пакаёвыя расліны. Аднак не ўсе ў поўнай меры ўсведамляюць іх карысць. Некаторыя з іх здольныя выдаляць таксіны з паветра, іншыя дапамагаюць дзіцяці сканцэнтравацца на вучобе. Давайце звернем увагу на самыя карысныя ва ўсіх сэнсах слова пакаёвыя расліны.**

### Лечаць траўмы

Алоэ вера (Aloe barberae), таксама вядомае як лілея пустыні, — непатрабавальная лекавая расліна. У яе сапраўды шмат карысных уласцівасцяў, напрыклад, ачышчэнне паветра.



Сок, які змяшчаецца ў лісці алоэ вера, выкарыстоўваюць для гаення парэзаў і апёкаў, у тым ліку сонечных. Ужо ў Старажытным Егіпце ведалі пра ўласцівасці гэтай расліны, ужываючы для лячэння апёкаў, інфекцый і барацьбы з насякомымі. Пару ад адвару з лісця алоэ таксама выкарыстоўваюць для палягчэння прыступаў астмы.

### Ачышчаюць паветра

НАСА правяло даследаванне, каб вызначыць, якія расліны дапамагаюць ачышчаць паветра, якім мы дыхаем, знішчаючы шкодныя таксіны. Хларафітум (Chlorophytum comosum) — адна з такіх раслін.



Гэтая кветка карыстаецца вялікай папулярнасцю. Акрамя таго, яе вельмі проста разводзіць. Хларафітум ачышчае паветра ад бензолу, фармальдэгіду, аксіду вугляроду і ксілолу. Усё гэта лятучыя арганічныя злучэнні, якія трапляюць у наш дом з мэбляй, дыванамі і звычайнымі бытавымі сродкамі.



Фікус эластычны (Ficus elastica) — яшчэ адна расліна са спіса НАСА. Гэта папулярная дэкаратыўная расліна з тоўстым бліскучым лісцем авальнай формы.

Гэтая разнавіднасць фікуса выдатна ачышчае паветра ад такіх таксінаў, як фармальдэгід. Фармальдэгід трапляе ў паветра за кошт мэблі і пакрыцця падлог, а таксама такіх сродкаў, як асвяжальнікі паветра, лакі для валасоў або пазногцяў.

Багата выпрацоўвае кіслароду сансэвіерыя (Sansevieria trifasciata), таксама вядомая як цешчын язык, — вельмі непатрабавальная і распаўсюджаная расліна з доўгім шчыльным лісцем, якое можа ўпрыгожыць любое памяшканне.



Усе мы ведаем, што, калі чалавек выдыхае вуглякіслы газ, расліны выконваюць супрацьлеглае дзеянне, выдзяляючы кісларод. Большасць раслін робяць гэта на працягу дня, аднак сансэвіерыя — адна з нешматлікіх раслін, якія выдзяляюць кісларод і ноччу, што робіць яе ідэальнай кветкай для спальні.

Парада: Пастаўце гаршчок з сансэвіерыей у радыусе 2 метраў ад таго месца, дзе вы спіце або праводзіце шмат часу, каб дамагчыся максімальнага эфекту.

### Увільгатняюць паветра

Прыкладна на 10 працэнтаў паветра, якім мы дыхаем, увільгатняецца за кошт раслін. Дыпсіс (Chrysalidocarpus lutescens) — адна з самых папулярных пакаёвых пальмаў. Гэтая пальма з сакавітым лісцем насычае паветра вільгаццю, што асабліва важна ў зімовыя месяцы. Такія расліны, як, напрыклад, кактусы або сукуленты, наадварот, акумулююць ваду і таму вылучаюць мала вільгаці.



### Даюць прыемны пах



Каб напоўніць свой дом асвяжальным водарам, замест таго, каб выкарыстоўваць бытавую хімію, завядзіце ў ім расліны з прыемным пахам — такія, як кафіраў-лайм (Citrus hystrix). Гэтая расліна не ўтрымлівае ніякіх хімікатаў, яна з'яўляецца не толькі выдатным спосабам асвяжыць дом, але і незаменная на кухні.

### Памяншаюць стрэс

Даследаванні паказалі, што расліны дома і на рабоце пазітыўна ўплываюць на чалавека, дапамагаючы знізіць стрэс і стомленасць і павысіць прадукцыйнасць.



Пастаўце пакаёвыя расліны, асабліва кветкі з доўгім лісцем, на рабочым стале ў офісе або дома, а таксама ў тым пакоі, дзе вашы дзеці робяць хатняе заданне або вучацца. Любыя пальмы, а асабліва хамедарэя (Chamaedorea seifrizii) або фікус Бенджаміна (Ficus benjamina), будуць рэгуляваць вільготнасць паветра ў памяшканні і знізяць у ім узровень вуглякіслага газу.



### Дапамагаюць пры бяссонніцы

У нас не заўсёды атрымліваецца спаць на працягу рэкамендаваных сямі ці васьмі гадзін, асабліва калі мозг заняты пастаяннымі думкамі пра тое, што адбылося за дзень і што неабходна зрабіць заўтра.





Згодна з даследаваннямі, выдзяленні некаторых раслін — такіх, як лаванда (Lavandula) і язмін (Jasminum), — спрыяюць больш спакойнаму сну. Пах гэтых кветак стварае адчуванне спакою, якое дапаможа вам лепш падрыхтавацца да сну.

### Уздымаюць настрой

Калі нам нядужыцца, нішто так не падымае настрой, як падарунак у выглядзе расліны ў гаршку або букета. Даследаванні паказалі, што ў бальніцах пацыенты, у чыіх палатах стаяць кветкі ці вокны якіх выходзяць у сад, ідуць на папраўку куды хутчэй, чым пацыенты без раслін вакол.

Расліны падымаюць настрой і дапамагаюць нам адчуваць сябе больш разняволенымі і абароненымі. Яны таксама дапамагаюць справіцца з адзінотай і дэпрэсіяй. Клопат аб жывым арганізме дае нам пачуццё мэты і задавальненне, асабліва калі расліна, пра якую мы з любоўю клапаціліся, пачынае цвісці. У якасці першых падапечных выберыце якія-небудзь непатрабавальныя кветкі, такія як узамбарскія фіялкі (Saintpaulia). Яны цвітуць на працягу ўсяго года і не патрабуюць складанага догляду.



## СЁННЯ

| Сонца | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 8.39 | 17.09 | 8.30 |
| Віцебск — | 8.34 | 16.53 | 8.19 |
| Магілёў — | 8.29 | 16.59 | 8.30 |
| Гомель — | 8.20 | 17.02 | 8.42 |
| Гродна — | 8.53 | 17.25 | 8.32 |
| Брэст — | 8.48 | 17.32 | 8.44 |

### Месяц

***Поўня 14.11—20.11.***
***Месяц у сузор'і Цяльца.***

### Імяніны

***Пр.*** *Еўдакіі, Аляксандра, Васіля, Вікенція, Георгія, Іосіфа, Мікалая.*
***К.*** *Гертруды, Малгажаты, Марка.*



Фота Марыны ГАРЭЛАВАЙ.

## ЗАЎТРА




УСМІХНЕМСЯ

**Званок па тэлефоне.**
**— Добры дзень, скажыце, я ў морг трапіў?**
**— Не, вы пакуль сюды яшчэ толькі тэлефануеце.**

Дзяўчына спакушае хлопца.
— Ты толькі паглядзі на мяне. У мяне скура, як персік, вусны, як спелая вішня, вочы, як дзівосны вінаград...
— Хм... А мяса-малочнае ёсць штонебудзь?

**Класічны гардэроб любой жанчыны:**
**1. Надзець няма чаго.**
**2. Вешаць няма куды.**
**3. Выкінуць шкада.**
**4. І спецыяльная паліца: «Раптам пахудзею».**




Малюнак Аляксандра КАРШАКЕВІЧА.


ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), В. МЯДЗВЕДЗЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК (намеснік галоўнага рэдактара).

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмная — 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 284 44 04, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 44 12, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гомелі: 28 27 27, Магілёве: 32 74 31, па Мінскай вобл.: (017) 292 21 03; бухгалтэрыі: 287 18 81.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні дае публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар.
Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 4531.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 15 лістапада 2016 года.